Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЖНІЎНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 152 (27517) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Вядучы на тэлебачанні павінен быць асобай, сцвярджае Кацярына Цішкевіч. Меркаваннямі пра сакрэты прафесіяналаў, уменне быць канкурэнтаздольнымі і «прабелы» ў праграме перадач яна дзеліцца з намі.** СТАР. 3



**Сёлета ўсё часцей і часцей аб'ектам сямейных размоў на кухні становіцца лічбавае тэлебачанне. Колькі грошай збіраць? Куды ісці? Як выбіраць і што купляць? І, вядома ж, анікому не хочацца памыліцца.** СТАР. 6



**На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by і чытачоў газеты «Звязда» адказала загадчыца хірургічнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна МІХАЙЛАВА.** СТАР. 6

## УДАСКАНАЛЬВАЦЬ СІСТЭМУ ПРАФЕСІЙНАГА ПЕНСІЙНАГА СТРАХАВАННЯ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ўчора прыняў з дакладам міністра працы і сацыяльнай абароны Мар'яну Шчоткіну. У цэнтры ўвагі былі пытанні ўдасканальвання сістэмы прафесійнага пенсійнага страхавання, а таксама выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць малалетніх дзяцей, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Закон аб прафесійным пенсійным страхаванні ўступіў у сілу з 1 студзеня 2009 года. Кіраўніку дзяржавы быў прадстаўлены праект указа, згодна з якім работнікі, занятыя ў асаблівых умовах працы, якія маюць да пачатку дзеяння закона не менш як палову спецыяльнага стажу, атрымаюць права атрымліваць датэрміновыя пенсіі па ранейшым заканадаўстве, гэта значыць з агульнай пенсійнай сістэмы. Прэзідэнт гэту прапанову падтрымаў.

Што датычыцца тых, хто да 1 студзеня 2009 года выпрацаваў менш як палову спецыяльнага стажу, то ім акрамя магчымасці атрымліваць або датэрміновыя, або дадатковыя пенсіі пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту прадастаўляецца яшчэ адно права — па дамоўленасці з наймальнікам працэнт адлічэнняў можа праводзіцца не ў фонд сацыяльнай абароны, а да заработнай платы. Пры гэтым прапануецца павялічыць адлічэнні на прафесійнае пенсійнае страхаванне.

Прэзідэнту было таксама далажана аб дзейнасці наймальнікаў па ахове і паляпшэнні ўмоў для работнікаў, занятых у асаблівых умовах працы, узроўні іх зарплат, умовах атрымання пенсій, у тым ліку і датэрміновых. Марыяна Шчоткіна падкрэсліла, што ў Беларусі інстытут датэрміновых пенсій захаваўся, хоць у шэрагу дзяржаў ён або ліквідаваны, або больш жорсткі.

Кіраўніку дзяржавы таксама быў прадстаўлены праект указа, які датычыцца некаторых пытанняў назначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. СТАР. 2

## ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ — ТОЛЬКІ ЗА ВЫСОКІЯ РЭЗУЛЬТАТЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абяцае спартсменам вялікія грошы толькі за высокія рэзультаты. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора на нарадзе аб праблемах БФСТ «Дынама» і шляхах іх вырашэння, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Грошы будуць плаціцца, і вельмі вялікія, за рэзультат. Няма рэзультату — няма грошай», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі нямала робіцца для развіцця спорту, асабліва ў плане інфраструктуры. «Для жыхароў усіх рэгіёнаў сталі даступны заняткі практычна любым відам спорту», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на ўсё гэта дзяржавай трацяцца вялікія сродкі, і яна мае права чакаць ад спартыўнай сферы важкай аддачы і высокіх дасягненняў і перамог.

«У канцы нашай сустрэчы мы паглядзім, якія дасягненні і перамогі, тым больш ёсць пэўныя крытэрыі. Прайшлі, наколькі я назіраю, тры чэмпіянаты свету — па фехтаванні, плаванні, завяршаецца па лёгкай атлетыцы», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што хацеў бы пачуць, якіх рэзультатаў дасягнулі беларускія спартсмены ў гэтых відах спорту.

«Няўдачныя выступленні і нашых вядучых клубаў, атлетаў, аб якіх я толькі што сказаў, на міжнародных спаборніцтвах паказваюць, што праблем, недапрацовак у гэтай галіне хапае», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, першыя крокі для іх вырашэння зроблены, у тым ліку і па «Дынама». «Мы фактычна замянілі кіраўнікоў па асноўных напрамках, сфарміравана тройка кіраўнікоў — міністр спорту і турызму, памочнік Прэзідэнта па пытаннях фізкультуры, спорту і развіцця турызму і першы віцэ-прэзідэнт НАК, — якія ўтраіх адказваюць, перш за ўсё, перад Прэзідэнтам, за стан спраў у спорце», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка лічыць: «Ужо настаў час нешта выразна сказаць і гэтай тройцы. Паслухаем іх».

На нарадзе асаблівая ўвага ўдзялялася ўдасканаленню дзейнасці БФСТ «Дынама». Як падкрэсліў Прэзідэнт, пакуль што многа прэтэнзій да гэтага таварыства. «Месца і роля аб'яднання ў рэспубліканскай сістэме фізічнай культуры і спорту да гэтага часу дакладна не вызначаны. Не адпрацаваны механізм узаемадзеяння таварыства з іншымі спартыўнымі структурамі. Цяперашняя арганізацыйная структура таварыства не здольна эфектыўна вырашаць існуючыя задачы. Адсутнічаюць пастаянныя крыніцы пазабюджэтнага фінансавання», — канстатаваў ён.

БФСТ «Дынама» адведзена асаблівая роля ў спартыўнай структуры краіны, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Як лічыць кіраўнік дзяржавы, таварыства павінна вырашаць задачы, звязаныя як са спортам вышэйшых дасягненняў і падрыхтоўкай рэзерву, так і з дзейнасцю органаў бяспекі і правапарадку нашай краіны. На нарадзе разглядалася, якія канкрэтна захады для выканання гэтага робяцца, што перашкаджае эфектыўнай рабоце. СТАР. 2

■ Маладое жніво

## «ГОРКАЯ ПРАЦА, ЗАТОЕ САЛОДКІ ХЛЕБ!»





Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Не сёння-заўтра на смалявіцкай зямлі адзначаць раённыя «Дажынкі» — свята заканчэння жніва. «Нам бы толькі пару дзянёчкаў, каб паспець!» — хвалююцца аграрыі. Працаўнікі сельскай гаспадаркі рады кожнаму сонечнаму дню, тым больш калі жніво выходзіць на фінішную прамую. Зараз у раёне ўбрана 90% плошчаў збожжавых і зернебабовых.**

Сёлета ў Смалявіцкім раёне ўшаноўвалі шаснаццаць экіпажаў-«тысячнікаў», восем з якіх працуюць у «Жодзіна-Агра Плем Эліта». У маладой гаспадарцы і малады калектыў: амаль палова супрацоўнікаў — ва ўзросце да 30 гадоў. Магчыма, менавіта гэта дапамагае быць першымі ва ўсім?

Яраслаў ЦВІРКО і Міхаіл САБАЛЕЎСКІ сёлета разам працуюць упершыню. Але гэта не перашкодзіла хлопцам даўно намалаціць «сваю» тысячу тон збожжа. Яраслаў, які дагэтуль чатыры гады адпрацаваў на трактары, з задавальненнем перайшоў на камбайн. Кажа, што работа яму спадабалася: у добрай камандзе і працуецца выдатна.

У гаспадарцы ёсць і чатыры кіроўцы-«тысячнікі». Аляксей ГУБАРЭВІЧ, як толькі скончыў школу, адразу прыйшоў у гаспадарку працаваць вадзіцелем. Ды і як не пайсці, калі ўсе сваякі працуюць разам — сапраўдная сямейная дынастыя! Бацька Уладзімір Мікалаевіч — механізатар, маці Галіна Анатольеўна — палявод, браты, родны і стрыечны, дзядзька — усе працуюць на зямлі.

Па аператыўнай інфармацыі, усяго ў краіне ўбрана каля 85% плошчаў збожжавых і зернебабовых. Намалочана больш за 6 млн тон збожжа. Плануецца, што сёлета Беларусь атрымае больш за 9 млн тон ураджаю збожжавых з улікам кукурузы.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*в. Белая Лужа.*

■ Актуальна

Сяргей МАСКЕВІЧ:

## «ВОСТРАГА ДЭФІЦЫТУ КАДРАЎ ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ НЯМА»

**Сістэма адукацыі і школьныя настаўнікі цалкам гатовы да пераходу на новыя правілы арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы. У гэтым запэўніў журналістаў на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ.**

Нагадаем, што Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ўступіў у дзеянне яшчэ 1 верасня 2010 года. Аднак да 1 верасня гэтага года ў школах дзейнічаў трохгадовы «мараторый»: на працягу пераходнага перыяду настаўнікі абавязаны былі выпраўляць у работах сваіх вучняў памылкі, звязаныя са змяненнямі ў арфаграфіі і пунктуацыі, але не ўлічваць гэтыя памылкі пры выстаўленні адзнак. На выпускных экзаменах і на ўступных іспытах словы, у правапісе якіх адбыліся змяненні, выкарыстоўвацца таксама не маглі. Але ў новым навучальным годзе і педагогам, і школьнікам давядзецца прадэманстраваць сваю дасведчанасць ва ўсіх нюансах новай беларускай арфаграфіі. Пры правядзенні ў 2014 годзе цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове тэставыя заданні таксама будуць рыхтавацца ў адпаведнасці з апошняй рэдакцыяй «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ:**

***«Паспяховая эканоміка, якая складаецца з умелай арганізацыі працы і павышэння прадукцыйнасці, дае магчымасць у многім вырашыць сацыяльныя праблемы працоўных калектываў... Трэба лічыць кожную капейку. Гэта наша зямля, і чым больш мы будзем аб гэтым думаць, чым акуратней будзем ставіцца да кожнага свайго кроку, тым будзе гэта зямля прыгажэйшай, больш магутнай і багатай дзяржава, больш камфортным і дастойным наша жыццё».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.08.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8910,00 | ▼ |
| Еўра | 11830,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 270,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1097,25 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 23° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 23° |
| Гродна | + 22° |
| Магілёў | + 22° |
| Мінск | + 21° |

■ Надвор'е

## На выхадныя — сонечна і цёпла

**Антыцыклон, што рухаецца да нас з боку Заходняй Еўропы, істотна палепшыць надвор'е на тэрыторыі Беларусі ў бліжэйшыя дні, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Ужо сёння ў нашай краіне чакаецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ад плюс 20 градусаў па поўначы, да 26 цяпла па поўдні Беларусі. Павышаны фон атмасфернага ціску захаваецца ў нас і ў выхадныя. Таму ападкаў не прадбачыцца, а ўначы і раніцай чакаецца туман. Тэмпература паветра ў ноч на суботу знізіцца да плюс 6-12 градусаў, а ўдзень сонейка прыгрэе да 22-28 цяпла. У ноч на нядзелю крыху пацяплее і стане ўжо плюс 7-14 градусаў. Удзень тэмпературны фон будзе дасягаць 23-28 цяпла, а па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — да плюс 30 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### УКРАІНУ ЧАКАЮЦЬ МІЛЬЯРДНЫЯ СТРАТЫ АД «БАЙКОТУ» РАСІІ

Украіна можа страціць мільярды долараў з-за прыпынку экспарту ў Расію толькі гародніны і садавіны. На долю РФ даводзіцца не менш за 80% ад усяго экспарту свежай і перапрацаванай плодаагароднінай прадукцыі з Украіны, перадае сайт «АПК-Інформ». Экспарт украінскіх тавараў у РФ у другім паўгоддзі 2013 года прагназаваўся на ўзроўні 8,5 млрд долараў. Пасля прыпынку экспарту страты Украіны могуць дасягнуць у другім паўгоддзі 2-2,5 млрд долараў, лічыць Федэрацыя працадаўцаў Украіны. Праблемы ва ўкраінскіх экспарцёраў на расійскай мытні пачаліся ў канцы ліпеня. А з 14 жніўня мытная служба РФ уключыла ў пералік «рызыкоўных» усіх без выключэння ўкраінскіх імпарцёраў, што, паводле ацэнак Федэрацыі, азначае поўны прыпынак украінскага экспарту на няпэўны час.

### З КАРТЫ ТБІЛІСІ СЦІРАЮЦЬ ПАМЯЦЬ АБ «РЭВАЛЮЦЫІ РУЖ»

Плошча Рэвалюцыі руж у цэнтры Тбілісі пераймянуюць у гонар вядомага дысідэнта 1980-х гадоў Мараба Костава, паведамляе «Навіны-Грузія» са спасылкай на прэс-службу гарсавета. Дэпутаты плануюць перайменаваць яшчэ некалькі аб'ектаў: Тбіліскі міжнародны аэрапорт будзе названы іменем першага грузінскага прэзідэнта Звіяда Гамсахурдзія, плошча Еўропы можа «перамясціцца» — яе назва будзе аддадзена парку Рыке, а ёй прысвояць імя Ста тысяч пакутнікаў, удакладняе «Грузія Online».

### КАВУН ЗНІЖАЕ ЦІСК, РЫЗЫКУ ІНСУЛЬТУ І ІНФАРКТУ



Хімічнае злучэнне, якое змяшчаецца ў кавуне, спрыяе вываду малочнай кіслаты з тканак цела. Гэта дапамагае спартсменам больш эфектыўна трэніравацца і хутчэй аднаўляцца, піша The Telegraph. Такім чынам, у кавуне змяшчаецца амінакіслата L-цітрулін. Гэтая амінакіслата звязана з аксідам азоту, які пашырае крывяносныя сасуды. Па гэтай прычыне кавун, як лічыцца, зніжае ціск, рызыку інсульту і інфаркту. На думку спецыялістаў, кавуновы сок цалкам можа замяніць сродкі, якія памяншаюць мышачную стомленасць і скарачаюць рызыку хвароб сасудаў, сэрца, здымаюць стрэс, выкліканы празмернымі фізічнымі нагрузкамі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЕГІПЕТ: КОЛЬКАСЦЬ ЗАГІНУЛЫХ НАБЛІЖАЕЦЦА ДА ТЫСЯЧЫ



**Становішча ў егіпецкіх гарадах, перш за ўсё ў Каіры, застаецца напружаным пасля ўчарашняй бойні.**

Прыхільнікі звергнутага прэзідэнта, «браты-мусульмане», сілавы разгон якіх прывёў да гібелі сотняў чалавек, паабяцалі вывесці людзей на вуліцы з мэтай выказвання пратэсту супраць забойстваў. Тым часам працягваецца падлік ахвяр вулічных сутыкненняў. Да сярэдзіны дня 15 жніўня афіцыйныя ўлады Егіпта пацвердзілі гібель 525 чалавек, сярод іх больш за 40 — паліцэйскія, перадае AP. Параненых, паводле афіцыйных падлікаў, ужо больш за 3700 чалавек. Аднак у хуткім часе можна чакаць папаўнення журботных спісаў, паколькі паступаюць паведамленні пра ўсё новых загінулых. Так, з адной з мячэцяў у Каіры ўчора днём былі вывезены целы каля дзвюх сотняў чалавек, перадае Reuters. Нагадаем, што многія людзі на плошчы загінулі ад агню снайпераў. Доказаў прыналежнасці снайпераў да ўрадавых сіл пакуль не паступала. У той жа час былі паведамленні аб тым, што на дахах у Каіры заселі, якраз наадварот, ісламісцкія стралкі.

КОРАТКА

У аб'яднанай сістэме процiпаветранай абароны краін СНД пачаліся сумесныя вучэнні «Баявая садружнасць-2013». Манеўры пройдуць у тры этапы і прадоўжацца да 12 верасня. У іх прымуць удзел больш як 500 ваеннаслужачых, будуць задзейнічаны звыш 100 адзінак баявой і спецыяльнай тэхнікі войскаў.

Міжнародны кулінарны фестываль пройдзе 17-18 жніўня ў мінскім парку імя Горкага. Гасцей фестывалю чакаюць дэгустацыі, розныя конкурсы, канцэртная праграма. Таксама арганізатары падрыхтавалі майстар-класы знакамітых повараў па беларускай кухні і кухнях розных краін свету.

Суб'ектаў сферы гандлю і паслуг Беларусі абавязалі прымаць да аплаты ўсе банкаўскія карткі, выдадзеныя ў рамках зарплатных праектаў.

Расклад руху цягнікоў гарадскіх і рэгіянальных ліній эканомкласа з 20 жніўня будзе часова зменены ў сувязі з пачаткам рэканструкцыі прыпыначнага пункта Інстытут Культуры. Часовыя змяненні ў раскладзе руху датычацца і цягнікоў, якія адпраўляюцца з пунктаў Мінск-Паўночны, Мінск-Усходні і са станцыі Мінск-Пасажырскі.

## Не прымірэнне, а справа міру




**Франц Масер — сапраўдны немец, былы кіраўнік паліцыі акругі Дэсаў (зямля Саксонія-Ангальт), спецыяліст па канстытуцыйным праве. Ён некалькі разоў уваходзіў у лік міжнародных назіральнікаў падчас выбарчых кампаній у Рэспубліцы Беларусь.**

Аднак ёсць у гэтага выдатнага чалавека яшчэ адна падстава для цікавасці да нашай краіны — гэта справа, аб якой ён пажадаў расказаць на працягу інтэрв'ю.

***— Спадар Масер, у Беларусі вы сталі вядомым як міжнародны назіральнік, які насуперак волі заходніх міжнародных інстытутаў дамагаўся аб'ектыўнай ацэнкі выбарчага працэсу ў нашай краіне. З чым звязана такая ваша пазіцыя?***

— Перш за ўсё, з тым, што ў Беларусі сапраўды створана выдатная, добра адладжаная сістэма, якая забяспечвае свабоднае волевыяўленне грамадзян і аб'ектыўнае, справядлівае падвядзенне вынікаў галасавання. Паверце, нават для нас, немцаў, прамыя і роўныя выбары — гэта ўжо часам не такая ўжо і даступная справа. Напрыклад, калі праходзяць агульнаеўрапейскія выбары ў Еўрапарламент, для таго, каб абраць туды свайго кандыдата, неабходна сабраць 600 тысяч галасоў нямецкіх выбаршчыкаў. А ў Люксембургу досыць 6 тысяч галасоў! І дзе ж тут роўнасць?

Ці іншы прыклад — Еўрапейская камісія. Гэта нявыбарны орган, ён прызначаецца без якой-небудзь сувязі з волевыяўленнем грамадзян, але пры гэтым прымае дырэктывы, якія маюць найвышэйшую сілу на тэрыторыі ўсяго саюза.

Калі маеш справу з такой бюракратычнай машынай, ніякім чынам не падпарадкаванай інтарэсам выбаршчыкаў, пачынаеш больш уважліва прыглядацца да іншага, альтэрнатыўнага вопыту. І вопыт Беларусі ў гэтым сэнсе мне падаўся годным для вывучэння.

***— Аднак тыя ж інстытуцыйныя назіральнікі, ад АБСЕ, ПАСЕ, часта даюць іншыя, негатыўныя ацэнкі.***

— Ды гэта смешна! Па-першае, ацэнкі гэтыя непаслядоўныя. Яны негатыўна ацэньваюць, напрыклад, сітуацыю ў Беларусі, але пры гэтым цалкам ігнаруюць парушэнні правоў чалавека і свабод у саміх заходніх краінах.

Па-другое, ацэнкі гэтыя вызначаюцца не сутнасцю справы, а той устаноўкай, якая ёсць у назіральнікаў. Яны часам нават не ведаюць асноўных палажэнняў беларускага выбарчага заканадаўства. СТАР. 2

## УДАСКАНАЛЯЦЬ СІСТЭМУ ПРАФЕСІЙНАГА ПЕНСІЙНАГА СТРАХАВАННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Беларусі ў жанчын, якія працуюць, ёсць права прыпыніць сваю працоўную дзейнасць і пайсці ў сацыяльны водпуск па доглядзе дзіцяці, пакуль яму не споўніцца тры гады. У той час для самазанятых катэгорый работнікаў механізм па прыпыненні дзейнасці пакуль адсутнічае. У сувязі з гэтым яны вымушаны або ліквідаваць сваю дзейнасць і атрымліваць дапамогу на дзіця ў поўным аб'ёме, або прадаўжаць працаваць, але дапамога ім налічваецца ў памеры 50 працэнтаў. У прыватнасці, да гэтага часу адсутнічае механізм па прыпыненні дзейнасці для асобных катэгорый работнікаў, да якіх належаць індывідуальныя прадпрымальнікі, рамеснікі, прыватныя адвакаты, натарыусы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў распрацаваць простую і зручную сістэму прыпынення дзейнасці гэтых катэгорый работнікаў. Мінпрацы і сацабароны падрыхтуе і ўнясе праект указа ў бліжэйшы час. «Мы разумеем, што гэта прыпыненне чакаюць нашы грамадзяне. Ва ўсіх павінны быць роўныя правы, яны павінны быць забяспечаны дзяржавай», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

Кіраўніку дзяржавы таксама было даложана аб дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне ў цэлым. Аляксандр Лукашэнка чарговы раз звярнуў увагу, што дзейнасць усіх дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, прафсаюзаў павінна быць накіравана на тое, каб падтрымліваць сем'і, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей, разглядаючы кожны выпадак у індывідуальным парадку.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на неабходнасць дадатковых мер падтрымкі сем'яў, у тым ліку і для падрыхтоўкі да школы.

## ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ — ТОЛЬКІ ЗА ВЫСОКІЯ РЭЗУЛЬТАТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Прайшоў пэўны час пасля таго, як былі прыняты асноўныя рашэнні па рэгуляванні даходаў і нават зарплаты спартсменаў. Колькасць незадаволеных павялічылася на парадак. Незадаволеных чым? Дзяржава не дае грошай. Маўляў, мы хацелі б, каб нам у месяц плацілі $10 тыс., асобныя хакеісты патрабуюць, а нам плацяць усяго $2 тыс.».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт заявіў наступнае: «Грошы плаціць будзем толькі для таго, каб чалавек мог займацца, рыхтавацца да чэмпіянатаў і пяршынстваў, асноўныя даходы ён атрымае за рэзультат. Не за 21-е і 41-е месцы на чэмпіянатах, а за 1-е, 2-е, 3-е месцы, за перспектыву гэтага чалавека».

«Многія скажуць — пакуль той чэмпіянат свету, я павінен жыць, працаваць і, тым больш, шмат працаваць. Але для таго, каб жыў і старанна працаваў — табе адпаведная стаўка зарплаты. А потым — па выніках выступленняў, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Таму не трэба хадзіць і плакаць».

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што больш шалёных грошай у спорце не будзе: «Дастаў, паклаў на стол рэзультат — атрымай шалёныя грошы. Няма рэзультату — няма грошай».

Кіраўнік дзяржавы закрануў таксама тэмы дзейнасці спартыўных клубаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што тут існуе нямала праблем. «У нас што атрымалася? Перайшлі мы на клубную сістэму. Некаторыя панаствaралі клубы. Хтосьці раней бегаў з клюшкай за мячом, цяпер сталі ў клубах чыноўнікамі — кіраўнік клуба, 10 намеснікаў, 100 чыноўнікаў у гэтым клубе — і маленькая каманда пры ім 20-30 чалавек спартсменаў, 3 трэнеры. Хто асноўныя грошы атрымлівае? Чыноўнікі клубаў, і дай бог міністрам атрымліваць такую заработную плату. Дурніцы гэтай больш не будзе», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, клуб — гэта прадпрыемства, якое павінна зарабляць грошы. «Зарабляйце грошы, трацьце іх. Колькі зарабілі, столькі і трацьце», — сказаў Прэзідэнт.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што «датацыі з бюджэту мы павінны накіраваць толькі спартсменам, толькі трэнерам, урачам і некалькім спецыялістам-сэрвісменам».

Прэзідэнт падкрэсліў важнасць развіцця ў краіне дзіцячага спорту, без якога няма вялікага спорту.

На сённяшняй нарадзе па ўсіх агучаных пытаннях выкажуць свой пункт гледжання міністр спорту і турызму, памочнік Прэзідэнта Беларусі па пытаннях фізкультуры, спорту і развіцця турызму і першы віцэ-прэзідэнт НАК.

# «ВОСТРАГА ДЭФІЦЫТУ КАДРАЎ ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ НЯМА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Ва ўсіх настаўнікаў беларускай мовы і настаўнікаў, якія выкладаюць свой прадмет на беларускай мове, была магчымасць прайсці перападрыхтоўку на семінарах, прысвечаных асаблівасцям новых правілаў беларускай арфаграфіі, — расказаў Сяргей Маскевіч.— Падручнікі перавыдаваліся ў апошнія гады таксама з улікам новых правапісных нормаў.

Між іншым, у папярэднім навучальным годзе колькасць школьнікаў, у якіх ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ўсе прадметы былі на беларускай мове, складала ўсяго 16,6 працэнта ад агульнай колькасці, а гісторыю Беларусі на беларускай мове вывучалі ўсяго 18% навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

— Я асабіста хацеў бы, каб дзеці і іх бацькі выбіралі для вывучэння гісторыі і геаграфіі Беларусі беларускую мову. Таму на нарадах і сустрэчах я заўсёды звяртаю ўвагу загадчыкаў раённых аддзелаў адукацыі і начальнікаў абласных упраўленняў адукацыі на тое, каб яны праводзілі работу па больш шырокім ужыванні ў школе беларускай мовы, каб агітавалі дзяцей і бацькоў за беларускую мову. Лічу, што гісторыя Беларусі — гэта той прадмет і той урок, дзе павінна гучаць беларуская мова. Але выбар усё роўна застаецца за школьнікамі і бацькамі...

### «Прафілізацыю» — у школы

Міністр адукацыі паведаміў журналістам, што ў новым навучальным годзе будуць функцыянаваць 3 тыс. 206 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку 219 гімназій, 28 ліцэяў і 8 кадэцкіх вучылішчаў. За школьныя парты сядуць 915 тысяч дзяцей, у тым ліку 99 тысяч першакласнікаў.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Да 1 верасня будуць уведзены ў строй 3 новыя ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі: сярэдняя школа на 216 месцаў у Воранаўскім раёне, школа на 1020 месцаў у сталічным мікраараёне «Лошыца-4» і вучэбна-педагагічны комплекс «сярэдняя школа — дзіцячы сад» на 950 месцаў у Салігорску.

Сяргей Маскевіч адзначыў, што ў сувязі з дэмаграфічнай сітуацыяй у будучым навучальным годзе перастануць функцыянаваць 109 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Таксама будуць зачынены 21 вячэрняя школа і 22 міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі навучэнцаў. Да таго ж да пачатку новага навучальнага года будуць рэарганізаваны 121 установа агульнай сярэдняй адукацыі і 4 вучэбна-вытворчыя камбінаты, якія стануць філіяламі іншых устаноў адукацыі. Падвозам да ўстаноў адукацыі будуць ахоплены больш як 76 тысяч школьнікаў.

У новым навучальным годзе Міністэрства адукацыі прадставіла магчымасць кіраўнікам школ арганізоўваць на старшай ступені школы вывучэнне тых ці іншых прадметаў на павышаным узроўні шляхам пераводу факультатыўных гадзін у вучэбныя. Размова ідзе пакуль толькі пра 10-я класы. Былі прапанаваны чатыры кірункі: фізіка-матэматычны, хіміка- біялагічны, філалагічны і грамадазнаўчы. Але для арганізацыі адукацыйнага працэсу з вывучэннем прадметаў на павышаным узроўні павінен выконвацца шэраг умоў. Па-першае, абавязкова павінна прысутнічаць гатоўнасць і зацікаўленасць у гэтым вучняў і іх бацькоў. Па-другое, «паглыбленне» ў навучанні немагчыма без прысутнасці ў школе высокакваліфікаваных педагагічных кадраў. Пад увагу таксама бралася матэрыяльна-тэхнічная база школы: ці дазваляе яна ў поўным аб'ёме рэалізаваць змест вучэбнай праграмы на павышаным узроўні? На жаль, пакуль што статыстыкай, колькі ж школ па краіне вырашылі ўкараняць ідэю «прафілізацыі», Міністэрства адукацыі не валодае. Паколькі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі знаходзяцца ў падпарадкаванні мясцовых органаў улады, поўная інфармацыя з'явіцца толькі ў верасні...

### Хто выйграе ад павышэння нагрузкі?

Закранаючы кадравае пытанне, Сяргей Маскевіч паведаміў прадстаўнікам СМІ, што сёння ў сістэме адукацыі працуюць 250 тысяч педагагічных работнікаў. Востраў праблемы дэфіцыту кадраў ва ўстановах адукацыі няма. У розных рэгіёнах у асобных школах ёсць вакансіі ва ўстановах дашкольнай адукацыі, а ў некаторых школах могуць быць вакансіі настаўнікаў фізікі, матэматыкі і інфарматыкі.

**«У папярэднім навучальным годзе сярэдняя нагрузка на настаўніка складала па краіне 22 гадзіны — многія педагогі працавалі больш, чым на стаўку. Відавочна, што цяпер сярэдні паказчык нагрузкі па краіне знізіцца»**

Не бачыць міністр і асаблівай катастрофы ў недаборы сёлета абітурыентаў на педагагічныя спецыяльнасці.

— Паколькі з гэтага года падрыхтоўка педагогаў перайшла на чатырохгадовы тэрмін навучання, то праз чатыры гады мы будзем мець на выхадзе з педагагічных спецыяльнасцяў універсітэтаў падвоены выпуск. І яшчэ можам сутыкнуцца з праблемай, куды ўсіх маладых педагогаў размеркаваць, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі кіраўнік галіны.

Між іншым, павелічэнне штотыднёвай педагагічнай нагрузкі на педагогаў з 18 да 20 гадзін таксама ўнесла свае карэктывы ў кадравы расклад: паводле папярэдніх падлікаў, колькасць штатных адзінак скароціцца на 17 тысяч. Але гэта не азначае, што аўтаматычна будуць скарочаны 17 тысяч чалавек. Колькасць педагогаў, занятых у сістэме адукацыі, як мяркуецца, зменшыцца ў наступным навучальным годзе прыблізна на 7 тысяч.

У папярэднім навучальным годзе сярэдняя нагрузка на настаўніка складала па краіне 22 гадзіны — многія педагогі працавалі больш, чым на стаўку. Відавочна, што цяпер сярэдні паказчык нагрузкі па краіне знізіцца. Праблематычна будзе знайсці поўную нагрузку настаўнікам геаграфіі, фізікі і некаторых іншых прадметаў, прычым не толькі ў сельскіх, але і ў буйных гарадскіх школах. Таму трэба будзе думаць, чым гэтых педагогаў нагрузіць, неабходна даць ім магчымасць для атрымання дадатковай кваліфікацыі за бюджэтныя сродкі, каб выкладалі дадатковыя прадметы, асабліва на ўзроўні базавай школы.

А наколькі ў грашовым вымярэнні ўзрастуць заробкі педагогаў у сувязі з запланаваным з 1 верасня павышэннем тарыфных ставак на 25 працэнтаў?

Высветлілася, што назваць гэтую лічбу вельмі праблематычна. Скажам, у маладога спецыяліста гэта будзе адна сума, а ў настаўніка вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі — зусім іншая. Зразумела толькі адно: калі педагог выконваў педагагічную нагрузку ў аб'ёме 18 гадзін, а цяпер у яго будзе 20 гадзін, то ён і сапраўды зарабіць больш з улікам розніцы ў нагрузцы. Але калі ў настаўніка аб'ём педагагічнай нагрузкі і раней складаў 20 гадзін і нават больш, то яго грашовая «дабаўка» будзе менш адчувальнай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Эканамікс

# ФІНАНСАВЫ ВЫДАТНІК

**«Звязда» прадстаўляе новую рубрыку, дзе будзе расказваць пра карыстанне грашыма і пра ўсё, што з гэтым звязана. Як бяспечна выкарыстоўваць пластыкавыя карткі? Якім чынам прымусіць свае грошы працаваць? Што рабіць у тых ці іншых спрэчных і складаных фінансавых сітуацыях? Мы чакаем пытанняў і ад вас, чытачы. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8-017-292-38-02.**

**ЯКІ КРЭДЫТ САПРАЎДЫ ТАННЕЙШЫ?**

З уступленнем у сілу новага Банкаўскага кодэкса ў Беларусі былі «знішчаны» ўсе камісіі па крэдытах, якія раней часта прапаноўвалі асобныя банкі. Аднак поўнай празрыстасці чакаць не выпадае. Так ці іначай банкі будуць імкнуцца ўзяць грошы хаця б за што-небудзь. Тым больш паказваць у рэкламе завоблачныя стаўкі нікому не захочацца.

Калі вы хочаце выбраць найбольш выгадны і прымальны для вас крэдыт (калі, дарэчы, ён сапраўды патрэбны і без яго ніяк не абысціся), то неабходна звяртаць увагу не толькі на стаўку, якую вам прапануюць. Так, насамрэч цяпер стаўкі больш адпавядаюць рэальнаму значэнню працэнтаў, якія вам трэба будзе заплаціць, бо банкі абавязаны так рабіць. Часам заяўленая і эфектыўная стаўкі вельмі моцна адрозніваюцца паміж сабою. Проста апошняя ўлічвае ўсе дадатковыя выплаты. Давайце возьмем для прыкладу спажывецкі крэдыт у 1 мільён рублёў на 3 месяцы, без паручыцеляў і даведак аб даходах. Прапаноў ад банкаў будзе вельмі шмат і з рознымі працэнтнымі стаўкамі — ад 0,01% (што часцей будзе спецыяльнай прапановай у пэўных гандлёвых сетках для куплі пэўных тавараў і фактычна з'яўляецца растэрміноўкай плацяжу) да 97% гадавых і нават вышэй. Рыхтуйцеся да таго, што аптымальным варыянтам, відаць, будзе стаўка ў 45% з пераплатай у 75 тысяч рублёў. Будуць вам трапляцца і прапановы са стаўкай, скажам, у 85%. Пры гэтым эфектыўная стаўка складзе больш за 200%. Чаму так атрымліваецца? Таму што банкі ўводзяць розныя дадатковыя плацяжы. Напрыклад, гэта можа быць плата за зняцце наяўных ці яшчэ што.

**ЗАЎСЁДЫ пытайцеся наконт усіх выплат, якія вы павінны будзеце зрабіць, калі прыходзіце ў банк па крэдыт (незалежна ад таго, які гэта крэдыт, — спажывецкі, на картку, экспрэс-крэдыт, крэдыт на нерухомасць і аўтамабіль). Гэта могуць аказацца: плата за афармленне дакументаў, за выпуск крэдытнай карткі, страхаванне, за зняцце наяўных сродкаў і гэтак далей.** Будзьце пільнымі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Памяці нашых калег

## СЛЕД ЗОРАК, ЗГАРЭЎШЫХ У ЖНІВЕНЬСКІМ НЕБЕ...



Яшчэ ўчора ўглядаліся ў начное неба, высочвалі ў зорных вышынях сляды-іскрынкі жнівеньскіх знічак. Яшчэ ўчора думалася, што знічкі падобныя на лёс тых, хто годна пражыў сваё жыццё і, пакідаючы нас, пасылае нам сваё апошняе кароткае святло.

А ўчора ў рэдакцыю прыйшла сумная вестка: памерла **Ніна Іванаўна КАЗАРМШЧЫКАВА.** У «Звяздзе» яна працавала даўно, пайшла на адпачынак больш за трыццаць гадоў таму. Работу ў газеце выконвала адказную — была на сувязі з нашымі карэспандэнтамі ў іншых гарадах Беларусі і прымала ад іх усю інфармацыю. У мінулыя дзесяцігоддзі сувязь з Нінай Іванаўнай «звяздоўцы» не гублялі. Часта бачыліся, тэлефанавалі, запрашалі ў святочныя дні ў рэдакцыю, наведвалі яе.

Рыхтуючы гэтыя радкі, мы знайшлі ў архіве фотаздымак Ніны Іванаўны, зроблены мінулым летам. Такой, як на фота, яна заставалася да апошніх сваіх дзён. Яна не проста ўсміхалася суразмоўцам — яна асвятляла іх сваёй добразычлівай, цёплай усмешкай.

Яна развіталася з намі і пакінула на ўспамін такі ж светлы след, як тыя знічкі ў вечных нябёсах.

**Звяздоўцы**

## ЯЧМЕНЬ ПАПАЎНЯЕ «ЗАСЕКІ»

**Больш за 90 тысяч тон піваварнага ячменю паступіла нарыхтоўшчыкам ад сельскагаспадарчых арганізацый краіны, што складае 60 працэнтаў ад дзяржзаказу, паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».**

Аб'ём дзяржаўнага задання на нарыхтоўку піваварнага ячменю сёлета складае 150 тысяч тон. Брэсцкая вобласць павінна пакласці «ў засекі» 36 тысяч тон, Віцебская — 20 тысяч тон, Гродзенская — 35 тысяч тон, Мінская — 45 тысяч тон, Магілёўская — 14 тысяч тон. Гомельская вобласць у выкананні дзяржзаказу не ўдзельнічае.

Статусам нарыхтоўшчыка надзелены адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Белсолад», «Крыніца», «Аліварыя», кампанія «Хайнекен». Для першых трох даведзена заданне, адпаведна, у 120 тысяч, 20 тысяч і 3 тысячы тон, для апошняй кампаніі — у 7 тысяч тон.

«Белсолад» нарыхтаваў ужо больш за 75 тысяч тон ячменю, што складае больш за 62 працэнты ад дзяржзаказу; «Крыніца» атрымала ад сельгасвытворцаў больш за 13 тысяч тон, або 67 працэнтаў; «Аліварыя» мае «ў актыве» 1,5 тысячы тон, або палову ад дзяржзадання.

Лідарам сярод рэгіёнаў па пастаўках піваварнага ячменю з'яўляецца Мінская вобласць, якая здала ў лік дзяржзаказу больш за 37 тысяч тон, выканаўшы яго на 84 працэнты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МІНСК ЛІДЗІРУЕ Ў СФЕРЫ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЛІКАЎ

**Удзельная вага разлікаў па плацежных картках у тавараабароце сталіцы самая высокая сярод рэгіёнаў краіны і складае 18,9%, паведамілі рэдакцыі ў Мінгарвыканкаме.**

Доля безнаяўных разлікаў са студзеня 2007 года па ліпень сёлета павялічылася ў 15 разоў. Усяго ў Мінску ўстаноўлена і дзейнічае больш за 15 тысяч тэрміналаў.

Разам з тым, многія арганізацыі гандлю і паслуг сталіцы не спяшаюцца ўводзіць безнаяўны разлік. Адна з прычын такога адцягвання — высокія тарыфы эквайрынгу (гэта паслуга банка, якая дазваляе арганізацыям прымаць банкаўскія пластыкавыя карткі ў якасці аплаты). Каб зацікавіць арганізацыі гандлю і паслуг у аснашчэнні аб'ектаў плацежнымі тэрміналамі, да канца года Нацыянальны банк Беларусі распрацуе шэраг рэкамендацый банкам рэспублікі для ўдасканалення аперацый з выкарыстаннем картак. Сярод іншага ім прапануюць перагледзець тарыфы на паслугі эквайрынгу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## БЕЛАРУСБАНК ПАДЛІЧЫЎ ГРОШЫ СВАІХ КЛІЕНТАЎ

**Валютныя ўклады насельніцтва тут складаюць больш за 3 млрд USD**

Рэсурсная база банка за студзень-ліпень сёлета павялічылася на 12%, або на 16 трлн рублёў, і склала 145 трлн рублёў, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

Спецыялістамі было падлічана, што сродкі фізічных асоб (без уліку налічаных працэнтаў і каштоўных папер) на пачатак жніўня склалі 44 трлн рублёў, у тым ліку: 18 трлн рублёў у беларускіх рублях, а ў замежнай валюце 3 млрд долараў у эквіваленце. Праз аблігацыі для фізічных асоб банкам было прыцягнута 989 млрд рублёў, у тым ліку: 26 млрд рублёў, 90 млн долараў і 14 млн еўра.

Сума прыцягнутых ад замежных банкаў і фінансавых кампаній замежных крэдытных рэсурсаў складае 1768 млн долараў. Крэдытны партфель складае 100 трлн рублёў, у тым ліку: крэдыты юрыдычным асобам — 66 трлн рублёў, крэдыты фізічным асобам — 34 трлн рублёў, у тым ліку льготныя крэдыты ў адпаведнасці з указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (№ № 13, 185, 195, 75, 368) — 30 трлн рублёў.

Доля безнаяўных аперацый па плацежных картках у агульным аб'ёме расходных аперацый з выкарыстаннем такіх картак у сетцы банка за ліпень гэтага года склала 24,8%. Усяго ў абарачэнні знаходзіцца больш за 5 млн плацежных картак адкрытага акцыянернага таварыства «АСБ Беларусбанк».

Па выніках працы на наяўным валютным рынку ў справаздачным перыядзе ўстановамі банка куплена замежнай валюты (з улікам канверсіі) у эквіваленце на суму 1 314,3 млн, а прададзена 1 235,2 млн долараў.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ** ■

## Белкаапсаюз недалічыўся 700 млн рублёў

**Камітэт дзяржаўнай бяспекі раскрыў дадатковыя факты праціпраўнай дзейнасці раней затрыманага начальніка ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў.**

Падчас рэалізацыі за кошт сродкаў інвестыцыйнага фонду Белкаапсаюза праекта «Будаўніцтва магазіна па вул. Тухачэўскага ў г. Ліда» гэты чыноўнік скарыстаўся службовым становішчам і дзейнічаў у інтарэсах камерцыйных структур. У выніку Белкаапсаюз страціў каля 700 млн рублёў. Таксама супрацоўнікі КДБ спынілі дзейнасць інжынера ўпраўлення вытворча-тэхналагічнай камплектацыі таварыства «Гроднапрамбуд», які арганізаваў злачынную схему раскрадання будматэрыялаў. Праводзіцца праверка магчымага незаконнага выкарыстання сіл і сродкаў прадпрыемства вышэйзгаданай асобай у інтарэсах камерцыйных структур Гродзеншчыны раней.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Не прымірэнне, а справа міру

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І, нарэшце, усім добра вядома, што негатыўная ацэнка выбараў 19 снежня 2010 года звязана, у першую чаргу, з тымі падзеямі, якія мелі месца пасля выбараў — з разгонам дэманстрацыі, зусім не мірнай, на плошчы Незалежнасці. Я быў там і бачыў, што адбывалася. Бачыў напад на Дом урада. Бачыў, як дзейнічалі беларускія сілы правапарадку. Як паліцэйскі, магу сказаць, што дзеянні гэтыя былі вельмі прафесійнымі і максімальна карэктнымі, без прымянення спецсродкаў і залішняй сілы. Мне таксама вядома аб замежным фінансаванні тых канкрэтных людзей, якія былі завадатарамі беспарадкаў 19 снежня 2010 года.

На жаль, заходнія міжнародныя назіральнікі часцей арыентаваны на тое, каб выконваць палітычны заказ, у тым ліку за кошт спакою ў канкрэтнай краіне. А я лічу для сябе галоўным — захаванне міру і стабільнасці.

***— Тады давайце пра гэта і пагаворым. Чаму вы сталі займацца праблемай нямецкіх ваенных пахаванняў на тэрыторыі Беларусі?***

— Напрыканцы 1990-х я займаўся гуманітарнымі праектамі дапамогі дзецям, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У той жа перыяд у Рагачоўскі райвыканкам звярнулася грамадзянка Германіі спадарыня Аонк з просьбай знайсці на тэрыторыі Беларусі пахаванне яе брата, які загінуў падчас Другой сусветнай вайны. Месца было знойдзена пры дапамозе архіўных даных і мясцовых жыхароў, у тым ліку — непасрэдных удзельнікаў вайны, якія вызвалялі гэтую зямлю. Цяпер недалёка ад вёскі Хадасовічы пры падтрымцы кіраўніцтва Рагачоўскага райвыканкама добраўладкаваны нямецкія ваенныя могілкі. Іх змагла наведаць спадарыня Аонк, іншыя зацікаўленыя людзі.

Пасля гэтага сталі паступаць аналагічныя просьбы ад іншых грамадзян, чые сваякі і сябры загінулі на тэрыторыі Беларусі. Калі ў 2006 годзе мы налічвалі каля 3500 групавых і адзіночных нямецкіх ваенных пахаванняў часоў Другой сусветнай вайны, то сёння размова ідзе пра больш чым 8 тысяч такіх месцаў толькі на тэрыторыі Беларусі.

***— Як у Беларусі ставяцца да вашай ініцыятывы?***

— З разуменнем. Мы атрымліваем поўнае садзейнічанне з боку беларускіх улад, грамадскіх аб'яднанняў, акадэмічнай супольнасці. І гэта мяне вельмі радуе.

Усе разумеюць: у нас няма мэты рабіць кідкія мемарыялы. Гаворка ідзе аб устанаўленні імёнаў загінулых і іх пахаванні, каб і сваякі ведалі, дзе яны ляжаць, куды можна прыехаць, каб ушанаваць памяць сваіх продкаў.

Я ведаю, колькі нацярпеліся беларусы падчас вайны. Але важна разумець і адваротнае: далёка не ўсе немцы ўчынялі гэтыя злачынствы і наогул хацелі ісці на вайну. Мой 19-гадовы брат прапаў без вестак пад Магілёвам у 1944 годзе. Ён быў малады, у яго ўсё жыццё было наперадзе, ён зусім не хацеў ісці ваяваць. Але ёсць палітычныя, гістарычныя працэсы, вырвацца з якіх асобны чалавек не можа.

Магу прывесці адну дзіўную гісторыю, звязаную з маёй працай. Нямецкая жанчына Ліла Тэвісэн беспаспяхова шукала свайго мужа, які служыў у радах Вермахта і ваяваў на тэрыторыі СССР. У яе з'явілася інфармацыя, што месца пахавання мужа знаходзіцца ў Расіі. Але калі яна прыехала туды, то зразумела, што яе муж спачывае не тут.

Тады яна, жыхарка Гамбурга, напісала пра сваю праблему ў адным з мясцовых часопісаў, які трапіў на вочы мне. І я вырашыў паспрабаваць дапамагчы ёй. Пасля працы ў нямецкіх архівах стала зразумела, што яе муж ваяваў і загінуў у Беларусі. Дзякуючы кантакту з беларускімі партнёрамі неўзабаве высветлілася, што гэты чалавек памёр, калі быў ваеннапалонным, непадалёк ад Рэчыцы. Пасля апытання мясцовых жыхароў месца пахавання было знойдзена. А далей дзякуючы садзейнічанню амбасадара Беларусі ў Германіі спадара Скварцова і мясцовых улад на месцы пахавання была абсталявана магіла. А нашчадкі гэтага салдата змаглі знайсці супакаенне, ушанаваўшы яго памяць.

У любым выпадку, вайна завяршылася. Беларусь і Германія — гэта два еўрапейскія народы, якія могуць і павінны ставіцца адзін да аднаго як суверэнныя дзяржавы і, такім чынам, роўныя партнёры. Некалі беларускія гарады мелі магдэбургскае права, а Беларусь і Германія фактычна межавалі, былі суседзямі. Мы — зусім не чужыя адзін аднаму народы.

Таму я бачу працу па ўвекавечанні памяці загінулых салдат як справу міру. Не прымірэння, як гэта любяць называць у сродках масавай інфармацыі, а будаўніцтва міру, мірных адносін дзвюх краін і двух народаў праз захаванне памяці аб загінулых.

***— Ваша праца, напэўна, атрымлівае ўсебаковую падтрымку з боку Германіі?***

— На жаль, не зусім так. Падтрымка ёсць, але раней яна была больш адчувальнай. Сёння ж, у тым ліку з-за маіх ацэнак палітычнага працэсу ў Беларусі, яна адчуваецца менш. Так, вышэйзгаданае пахаванне каля вёскі Хадасовічы я ствараў на свае ўласныя зберажэнні.

У цэлым, на жаль, падыход афіцыйных структур да гэтай праблемы не пазбаўлены недахопаў. Напрыклад, нямецкае аб'яднанне, упаўнаважанае федэральным урадам, пачынае дзейнічаць у дачыненні да пахаванняў, дзе знойдзены астанкі больш чым 50 чалавек. Адзіночныя пахаванні, могілкі ваеннапалонных і зніклыя без вестак выпадаюць з іх поля зроку. Таму такое важнае значэнне мае праца грамадскіх арганізацый, асобных энтузіястаў у гэтай сферы. Але падобная дзейнасць, вядома, усё роўна павінна праходзіць у адпаведнасці з заканадаўствам і ва ўзаемадзеянні з органамі ўлады.

***— Якія планы на будучыню ў гэтай важнай працы?***

— Зараз сабрана шмат інфармацыі аб пахаваных на тэрыторыі Беларусі нямецкіх салдатах Першай і Другой сусветных вайнаў.

Аказваецца, у перыяд 1914—1918 гадоў вельмі папулярным сярод нямецкіх салдат заняткам было рабіць фатаграфіі з лініі фронту. Існуе велізарная картатэка такіх фотакартак. Калі яе супаставіць з інфармацыяй аб загінулых, то можна ўшанаваць іх памяць, размясціўшы на месцах пахавання не толькі імёны і прозвішчы, але і фатаграфіі гэтых людзей. Улічваючы, што ў гісторыі Першай сусветнай вайны не было тых зверстваў і жорсткасцяў, якія прынёс нацызм, гэта магло б стаць вельмі перспектыўным праектам, які прыцягнуў бы на тэрыторыю Беларусі тысячы людзей з Германіі і іншых краін Еўропы.

З гісторыі Другой сусветнай вайны, як я ўжо казаў, у нас ёсць інфармацыя аб больш чым 8 тысячах месцах пахаванняў нямецкіх салдат. А ўсяго за час нашай працы з беларускімі ўладамі і грамадскімі арганізацыямі мы дапамаглі ўстанавіць імёны некалькіх дзясяткаў тысяч загінулых нямецкіх ваеннапалонных.

У нашых бліжэйшых планах — сістэматызаваць і выдаць гэтыя даныя для інфармавання, перш за ўсё сваякоў загінулых, а таксама федэральнага ўрада з мэтай прыцягнення ўвагі да этычнага боку пошукаў, рэканструкцыі нямецкіх пахаванняў і захавання іх як гістарычнай памяці, накіраванай на ўмацаванне і захаванне міру ў нашым агульным еўрапейскім доме для наступных пакаленняў. Спадзяюся, і ваша выданне ўнясе свой уклад у гэтую справу.

**Гутарыў Юрый ЦАРЫК.**

■ Гучная справа

## Для ўстанаўлення прычын смерці наведвальніка ўніверсама «Валгаград» прызначылі дадатковую экспертызу

**Канфлікт паміж ахоўнікам сталічнага ўніверсама «Валгаград» і 27-гадовым пакупніком адбыўся 30 чэрвеня. Падчас бойкі апошні аказаўся ў бессвядомым стане на бальнічным ложку. 14 жніўня ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя, што ён так і не прыйшоў у прытомнасць і памёр 8 жніўня. У яго засталіся жонка і 7-месячная дачка.**

Ва ўпраўленні Следчага камітэта па Мінску паведамілі, што ў дачыненні да супрацоўніка службы бяспекі ўніверсама «Валгаград» заведзена крымінальная справа. «Ён прызнаны падазраваным у прычыненні цяжкіх цялесных пашкоджанняў па неасцярожнасці (па артыкуле 155 КК)». Каб разабрацца ў гэтай заблытанай справе, адразу ж пасля інцыдэнту былі прызначаны неабходныя судова-медыцынскія і крыміналістычныя экспертызы, апытаны сведкі здарэння.

У Следчым камітэце праінфармавалі, што ў крыві пацярпелага знойдзены алкаголь і наркотыкі.

«Паводле медыцынскіх дакументаў, падчас інцыдэнту пацярпелы знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення — 2,19 праміле. Таксама ў яго крыві выяўлены сляды некалькіх наркатычных рэчываў, у тым ліку часцінкі асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў, што змяшчаюцца ў курыльных сумесях».

Пасля інфармацыі аб смерці следчыя органы неадкладна зрабілі выемку ўсіх медыцынскіх дакументаў пацярпелага з лячэбнай установы. Па іх прызначана дадатковая судова-медыцынская экспертыза.

«Высновы экспертаў будуць мець вызначальнае значэнне для ўсталявання ступені віны падазраванага, прычынна-следчай сувязі паміж дзеяннямі падазраванага і траўмамі, якія атрымаў пацярпелы, а таксама для далейшай прававой кваліфікацыі злачынства», — адзначылі ва ўпраўленні СК.

**Надзея ПАЎЛАВА** ■

**ОАО «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ»**
**вносит изменения в повестку дня общего собрания акционеров,**
*опубликованную в газете «Звязда» № 148 (27513) от 10.08.2013 г.,*
дополнив текст пунктом следующего содержания:
**«О внесении изменений в Устав Общества».**
УНП 100092167 *Совет директоров.*

■ Медыяперсона

## Кацярына ЦІШКЕВІЧ:

# «ВЯДУЧЫ НА ТЭЛЕБАЧАННІ ПАВІНЕН МЕЦЬ ДАПЫТЛІВЫ РОЗУМ»

**Вядучы на тэлебачанні павінен быць асобай, сцвярджае Кацярына Цішкевіч, якая працуе ў «Нашых навінах» на канале АНТ. Яе ўнутранае ўспрыманне рэчаіснасці адпавядае дынамічнаму руху сучаснага жыцця. Магчыма, таму ўсё складваецца так, як трэба: падрастае дачка — маме на радасць, ёсць праца, якая прыносіць задавальненне. Дабіўшыся таго, аб чым нават не марыла, Каця поспех спісвае на лёс і лічыць: што ні здараецца — усё да лепшага. Сваімі меркаваннямі пра галоўныя сакрэты прафесіяналаў, уменне быць канкурэнтаздольнымі і «прабелы» ў праграме перадач яна дзеліцца з намі.**




***— Сёлета вы атрымалі «Тэлевяршыню» як лепшая вядучая інфармацыйнай праграмы. Хацелася б даведацца, якая «цана» гэтай узнагароды?***

— Атрымаць яе пасля пяці гадоў працы ў эфіры вельмі прыемна і пачэсна. Калі разглядаць сітуацыю з пазіцыі гадоў, праведзеных на тэлебачанні, то магу сказаць, што гэты поспех — вынік карпатлівай працы над сабой. Давялося шмат папрацаваць над голасам, іміджам, над тым, каб «сесці ў кадр». Не заўсёды ёсць гарантыя, што намаганні, якія прыкладаеш, каб дасягнуць сваёй мэты, апраўдаюць сябе. Я рада, што мая праца над сабой дала такі вынік.

Акрамя таго, пастаянна працую над голасам. У ідэале трэба займацца кожны дзень. Але прафесіянал здольны інтуітыўна адсочваць патрэбу ў занятках такога кшталту. Калі ты выходзіш з працы, то акунаешся ў іншыя жыццёвыя клопаты. Аднак не варта забываць пра тое, чым ты зарабляеш на хлеб. Напрыклад, калі ўвечары ў мяне эфір, а раніцай гуляю з дачкой, то расказваю ёй скорагаворкі. Яна смяецца і з цікавасцю за мной назірае, а я тым часам сумяшчаю прыемнае з карысным.

**Зараз на першы план выходзяць дэталі. Інфармацыя можа быць аднолькавая, і, зразумела, нехта першым яе паведаміць. Але потым перавага будзе ў таго, хто здолее больш даведацца пра сітуацыю.**

***— Вядучы — чалавек з якімі якасцямі?***

— Перш за ўсё, вядучы павінен быць рознабакова развітай асобай. Сваю ролю адыгрывае і яго сталасць. Я зараз кажу не пра фізіялагічны ўзрост, бо, як вядома, у нас працуе шмат маладых людзей. Але яны маюць багаты ўнутраны свет, таму што і ў школе, і ў інстытуце добра над сабой працавалі. Шмат чыталі і могуць характарызавацца такім словазлучэннем, як «дапытлівы розум». Цікавяцца ўсім, і дзякуючы багатаму багажу практычнага вопыту маюць свой пункт гледжання па многіх пытаннях. Калі казаць пра характар, то я, напрыклад, экстраверт, унутры сябе нічога не трымаю. Ёсць эмоцыі — трэба іх выплеснуць. Мая праца дае для гэтага ўнікальную магчымасць. Не абысціся і без стрэсаўстойлівасці, бо ў эфіры здараюцца розныя сітуацыі: суфлёр можа згаснуць альбо матэрыял не будзе падрыхтаваны своечасова. Але вядучы, што б ні здарылася, павінен не разгубіцца і давесці справу да канца. У эфіры ўсё трэба зрабіць як след, таму што за табой стаіць вялікая колькасць людзей, якія рыхтуюць выпуск. Вядучы — апошняе звяно, і яго галоўная задача — цікава прадставіць гледачу карціну дня і зрабіць гэта так, каб ён выбраў наш канал.

***— Што робіце, каб заставацца «ў тонусе»?***

— У першую чаргу (думаю, вы са мной пагадзіцеся) трэба ўвесь час пісаць, чытаць, і не толькі інфармацыйныя сайты. Пастаяннае ўнутранае ўзбагачэнне вельмі важнае для чалавека, які працуе ў кадры. Камера «чытае» ўсё, і перад ёй не схлусіш. Можна па-акцёрску падаваць інфармацыю, але мне бліжэй пазіцыя «быць самім сабой».

***— У кожнага тэлеканала свая аўдыторыя. Якім вы ўяўляеце свайго гледача?***

— У эфіры я не думаю пра колькасць сваёй аўдыторыі. Бо гэта адцягвае ўвагу. Проста ведаю: ёсць людзі, якія глядзяць мяне зараз, і ім не ўсё роўна, што адбываецца ў нашай краіне і ў свеце. Тэлебачанне сёння наогул перажывае цікавы час, бо ўсё вельмі хутка змяняецца і рухаецца наперад. Ёсць пэўнае адчуванне, што газеты, часопісы і нават тэлебачанне можа «сысці» ў інтэрнэт. Камп'ютар і інтэрнэт сёння ёсць практычна ў кожнага, таму няма патрэбы чакаць вячэрніх навін, каб даведацца пра тое, што здарылася. Актуальная інфармацыя зараз даступна ўсім ахвотным у любую хвіліну.

***— Такім чынам, пытанне хуткасці перадачы інфармацыі сёння ўжо не актуальнае?***

— Зараз на першы план выходзяць дэталі. Інфармацыя можа быць аднолькавая, і, зразумела, нехта першым яе паведаміць. Але потым перавага будзе ў таго, хто здолее больш даведацца пра сітуацыю. І тут не ўсе могуць «капаць» аднолькава глыбока. Хуткасць адыходзіць на другі план. Аснова цяпер — змест, глыбіня і здольнасць яе адшукаць. Калі казаць пра «Нашы навіны», то мне вельмі падабаецца тое, што мы паказваем падзеі ў дынаміцы на працягу дня. Зараз нікога не зацікавіш канстатацыяй фактаў, людзям патрэбны падрабязнасці. Навіны павінны быць такімі ж дынамічнымі, як і наша жыццё.

**Нашы дзеці разбэшчаны свабодным доступам да інфармацыі. Часам ім нават складана патлумачыць, што тэлевізар і інтэрнэт — розныя рэчы. І атрымаць доступ да тых жа мультфільмаў у тэлевізары «тут і зараз» немагчыма па прынцыпе.**

***— Якія тэмы навінных выпускаў цікавяць вас асабіста?***

— Заўсёды імкнуся глыбей даследаваць пытанні, якія маюць практычны бок і непасрэдна датычацца мяне. Напрыклад, зараз цікаўлюся работай спецыяльнай камісіі пры Прэзідэнце па ліквідацыі даўгабудаў. Тэма будаўніцтва мне блізкая, бо я асабіста займаюся вырашэннем жыллёвага пытання. Пільна назіраю за падзеямі ў культурным жыцці краіны. Шмат цікавага адбываецца ў Мінску, а «Нашы навіны» даюць шыкоўную магчымасць даведацца, якое мерапрыемства і дзе лепш наведаць.

***— Сёння вельмі вялікі працэнт складаюць навіны са знакам «мінус». У чым, на ваш погляд, прычына?***

— Гэта тэндэнцыя часу. Моду на негатыў завялі ў свой час расійскія каналы. Там станоўчай інфармацыі было мала, і ў параўнанні з імі нашы выпускі навін здаваліся пазітыўнымі. Зразумела, што мы жывём у розных краінах, але прычына ў людзях. Аўдыторыю хутчэй зацікавіш нейкім здарэннем, чым добрай навіной. Нельга абагульняць і адказваць за ўсіх, аднак тэндэнцыя прэваліравання адмоўнай інфармацыі існуе. Падаюць самалёты, дзеці гінуць на дарогах... Станоўчы бок ад падачы такой інфармацыі таксама ёсць. І справа не толькі ў спачуванні. Магчыма, для некага такія навіны стануць напамінам, што варта быць больш абачлівымі.

***— Чаго ў наш час не хапае гледачам на тэлебачанні?***

— Перш за ўсё, на мой погляд, ёсць вялікая патрэба ў праграмах для дзяцей. Мне вельмі падабаўся праект «Дзеці новага пакалення», які некалькі гадоў таму выходзіў на «Беларусь-2». Ён закранаў сферу адукацыі. Каб адабраць удзельнікаў для яго, у школах праводзілі кастынгі. І гэта быў стымул для юнага пакалення заявіць пра сябе. Другі прыклад — «Я спяваю» на тэканале АНТ — дае шанц дзецям паказаць свае таленты. Чаму не працаваць у гэтым кірунку больш актыўна? У нас жа ёсць розныя ток-шоу, палітычныя і эканамічныя праграмы, а дзіцячая аўдыторыя застаецца ўбаку. Школьнік не будзе глядзець такія праграмы, бо ў яго ёсць інтэрнэт, дзе яму больш цікава. Але, калі вы прапануеце яму магчымасць з'явіцца ў кадры, паказаць, на што ён здольны, я ўпэўнена, ніхто не адмовіцца.

***— Тэлебачанне здольнае выхоўваць?***

— Я згодная з тым, што нашы дзеці разбэшчаны свабодным доступам да інфармацыі. Часам ім нават складана патлумачыць, што тэлевізар і інтэрнэт — розныя рэчы. І атрымаць доступ да тых жа мультфільмаў у тэлевізары «тут і зараз» немагчыма па прынцыпе. У гэтым плане дзякуючы ТБ у пэўнай меры прытупляецца пачуццё эгаізму. Тэлебачанне вучыць не патрабаваць нешта, а атрымліваць задавальненне ад таго, што ёсць галоўнае для бацькоў — памятаць, што з сынам ці з дачкой трэба больш размаўляць, бо, у першую чаргу, менавіта любоў і камунікацыя фарміруюць асобу.

**Алена ДРАПКО**

## «Місіс Сусвет» Святлана КУЗНЯЦОВА:

# «МЫ ПАВІННЫ ВЫХОЎВАЦЬ ХЛОПЧЫКАЎ ТАК, КАБ ЯНЫ ПАВАЖАЛІ ЖАНЧЫН»

**Беларуска Святлана Кузняцова перамагла на конкурсе «Місіс Сусвет-2013», які завяршыўся ў Арубе. Адным з этапаў спаборніцтва было выступленне аб тым, як краіна ўдзельніцы змагаецца з хатнім гвалтам. Святлана ў супрацоўніцтве з ЮНФПА ў Беларусі падрыхтавала даклад аб дасягненнях сваёй краіны:**



— У нас усё было цудоўна. На даклад адводзілася тры хвіліны... Я адзіная, хто расказаў, што ў нашай краіне рэальна нешта робіцца, працуе «гарачая лінія» 8 801 100 8 801, адкрыты крызісныя цэнтры, выпускаюцца дапаможнікі, тэма асвятляецца ў прэсе і на тэлебачанні. Я рыхтавалася грунтоўна. Дзякуючы ЮНФПА выступіла на «выдатна». Паралельна з выступленнем паказала відэаролік, у якім заклікаю жанчын не баяцца сказаць «не» гвалту...

Я сваім прыкладам вельмі жадаю паказаць усім жанчынам свету, што жыццё з нараджэннем дзяцей не заканчваецца, што можна сумяшчаць працу і сям'ю і заставацца пры гэтым прыгожай, любімай і жаданай. Але самае важнае, мы павінны выхоўваць сваіх дзяцей, асабліва хлопчыкаў (а ў мяне два сыны) так, каб яны паважалі жанчын. Дзеці бачаць стасункі бацькоў у сям'і і прымаюць такую мадэль паводзін, якую дубліруюць у дарослым жыцці...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Медыяпрастора

# «КІРАВА, 17»

**«Кірава, 17» — гэта адрас штаб-кватэры Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Таму і праграма, якая распавядае аб працы Выканкама СНД, называецца менавіта так.**

| | |
|---|---|
| Брэст | 106.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM |
| Мінск | 107.1 FM |
| Гродна | 104.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM |
| Бабруйск | 103.6 FM |
| Баранавічы | 98.4 FM |
| Салігорск | 104.3 FM |
| Пінск | 103.2 FM |

2013-ы — асаблівы год для нас. Беларусь старшынствуе ў СНД. Савет пастаянных прадстаўнікоў пры статутных і іншых органах Садружнасці ўзначаліў беларус Васіль Пугачоў. Найбуйнейшыя пасяджэнні на ўзроўні кіраўнікоў урадаў і прэзідэнтаў пройдуць у нашай краіне. Можна сказаць, што Мінск сёлета — двойчы сталіца СНД.

Штотыдзень у мінскай штаб-кватэры збіраюцца эксперты і разглядаюць на пленарных пасяджэннях дагаворы і пагадненні, якія закранаюць усе вобласці міждзяржаўных адносін. Адна з задач — уніфікаваць заканадаўства краін, стварыць для грамадзян адзінаццаці дзяржаў роўныя ўмовы для камфортнага жыцця і працы ў Садружнасці. Эксперты абмяркоўваюць і прызнанне дыпломаў, і налічэнне пенсій, і аказанне медыцынскай дапамогі, і правядзенне сумесных навуковых распрацовак, і арганізацыю культурных форумаў, і здымкі фільмаў.

Быць у курсе гэтых падзей, ведаць новыя падрабязнасці жыцця ў Садружнасці дапаможа праграма «Кірава, 17». Слухайце кожны панядзелак у 14.45 на «мірнай» хвалі!

■ Будзе свята!

## НЕ ФЭСТ, А «ЦУКЕРАЧКА»!

**Урачыстай, цікавай і, безумоўна, смачнай абяцае быць у пасёлку Івянец Валожынскага раёна субота, якая прыпадае на 7 верасня. Цукерачны фэст пад назвай «IVKON» запрашае ўсіх «падсаладзіць» свой дзень.**

Нягледзячы на тое, што гэтае свята пройдзе ўжо ў чацвёрты раз, арганізатары раяць усім гасцям чакаць шмат новых уражанняў. Іх можна будзе атрымаць, пачуўшы рамантычныя івянецкія легенды, пашукаўшы сувеніры на шчодрым рамесным кірмашы, пакаштаваўшы нацыянальныя стравы і напоі. Не абыдзецца без рыцарскіх баёў, дэгустацыі цукерак кампаніі «IVKON», жывой музыкі, спеваў, танцаў, конкурсаў і вечаровага фаер-шоу, а таксама выступлення многіх беларускіх этнагуртоў, сярод якіх «Літы Талер», «Хорціца», «Тутэйшая шляхта», «PAWA». Тых, хто вырашыць ператварыць свой выхадны ў салодкае задавальненне, чакаюць у Івянцы ў 13 гадзін на плошчы Свабоды, адкуль свята перамесціцца ў сядзібу Пятра Дарагунцава і працягнецца да 20.00.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# НЕАДОЛЬНАЕ

Анталогія беларускага верша пра каханне

*Песняй вясны лебядзінаю...*

*Вядучы Алесь Каско*

**У міфалогіі і фальклоры беларусаў вобразы птушак-птахаў маюць самыя розныя значэнні. Яны — сімвалы душы, духу жыцця, узнёсласці, волі, цыклаў дня, года, перыядаў чалавечага веку і г.д. Пашырана ў народных песнях увасабленне ў птушках дзяўчыны і хлопца, прычым спатканне якіх не заўсёды абяцае радасць: «Шэрая зязюлька, не ляці рана ў поле, бо там злове саколе...» У вершы Д. Бічэль «Чародка» яшчэ больш супярэчлівасці і напружання: веснавыя птахі, што «купаюцца высока між блакіту», сімвалізуюць маральную перашкоду ў адносінах паміж закаханымі. Гэта адчуванне розніцы ў гадах, нежаданне ахвяраваць воляю?.. Гама патаемных перажыванняў, сумятлівасць душы лірычнай гераіні паэтка перадае тонка і далікатна, у прыватнасці — праз рэфрэн, што абрываецца ў канцы верша: сіла кахання, мусіць жа, неадольная!**

Данута БІЧЭЛЬ

## Чародка

*Злучыла нас вясна*
*лукой адною.*
*Чародка птахаў*
*між табой і мною.*

*Прагнаць бы неслухмяную*
*чародку*
*за бор усхваляваны,*
*за паводку!*
*Купаюцца высока між блакіту.*
*А ты ідзеш да сонейка...*
*Які ты*
*прасветлены бязвоблачнымі*
*днямі!*

*Але чародка птахаў*
*паміж намі.*

*Адразу нешчаслівы і шчаслівы.*
*Адразу і распусны і цнатлівы,*
*так рызыкоўна —*
*смелы і нясмелы —*
*мне пасылаеш*
*маладыя стрэлы.*
*Узбунтаваў душу,*
*нібы цунамі.*

*Але чародка птахаў*
*паміж намі.*

*Прыкінуўся вясёлым панямонцам,*
*маім невыпадковым абаронцам.*
*Упарта наравістая адвага*
*у клетку рук зладзіла*
*сэрца-птаха...*
*І замаўляеш вуснамі дрыготка...*
*Але чародка...*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 19 ЖНІЎНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 22.50** Зона Х.
**8.45** Слова Мітрапаліта Філарэта на Праабражэнне Гасподняе.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00 Камедыя «Жандар на прагулцы».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.15** «Зорнае жыццё». «Чаго хочуць халасцякі?».
**14.15** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Тэлефільм АТН «Радзівілы. Тайны сям'і. Іншая серыя».
**15.55** Дак. серыял «Цуды прыроды».
**16.30** Усё як трэба!
**16.55 Меладрама «Кахаць па-руску-3. Губернатар».**
**19.20** Спецыяльны рэпартаж АТН.
**19.55 Серыял «Каралі гульні».**
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «У кожнага свая вайна». 1-я серыя.**
**23.25** Дзень спорту.
**23.40 Драма «Сола на саксафоне».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Танкер «Танга». Заключная серыя.**
**10.20, 23.55** Дак. серыял «Пад сонцам».
**11.15 Фільм-казка «Стары Хатабыч».**
**13.00 Серыял «Сустрэчная паласа». 1-я — 4-я серыі.**
**16.50, 23.10 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**19.00 Баявік «Аплачана смерцю». Фільм «Сад зямных асалод».**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Камедыя-фарс «Даўнхаус».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.00, 16.00, 23.20** «Мой горад». Петрыкаў.
**8.15, 15.55, 20.25** «Размовы пра духоўнае».
**8.20** «Карані».
**8.45** «Святло далёкай зоркі». Даніла Міцкевіч, які стварыў і захаваў музей свайго бацькі — Якуба Коласа.
**9.20** «Новы касмічны адлік». Дак. фільм.
**9.45** «Росчырк часу».
**10.00, 17.30 Дзіцячы фільм . «Летнія ўражанні аб планеце Z». 1-я серыя.**
**11.05** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Лебядзіны Мох-Патокі».
**11.35** «Лабірынты».
**12.15, 20.55 «Крушэнне імперыі». Маст. фільм.**
**13.50** «Маем рэчы». Маляваныя дываны.
**14.05** «Расце дуб...». Дак. фільм.
**14.25 «Халады ў пачатку вясны». Маст. фільм.**
**14.55** «Старажытнае слова. Лёс Міхаіла Баброўскага». Дак. фільм.
**15.25** «Настальжы». Заслужаная артыстка Беларусі Таццяна Мархель.
**16.15, 22.30** «Рыхтэр — чалавек-загадка». Дак. фільм. Фільм першы.
**17.10** «Палескі пачастунак». Суп з бульбы.
**18.35** «Таямніца душы».
**19.05** «Тэатр. Выбранае». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Андрэй Душачкін.
**19.30** «Хармс. Іншая лінія». Дак. фільм.
**20.00** «Пётр Конюх». Дак. фільм.
**20.30** Калыханка.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10 Серыял «Жаночы доктар 2».**
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Група «Zeta».**
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Хрушчоўская адліга. Выпрабаванне фестывалем».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Адналюбы».**
**22.10 Серыял «Цюдоры».**
**0.10 Камедыя «Міс Март».**
**1.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Вялікае снеданне».
**10.20** «Жыць будзеце».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35 Серыял «Слова жанчыне».**
**12.30** «Джэймі ў сябе дома-2».
**13.00** «Жанчыны XX стагоддзя».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Дайджэст.
**15.30** «Ежа багоў».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Падманутыя навукай».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Маст. фільм «Судны дзень».**
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.30 Серыял «Фірменная гісторыя».**

### МІР

**5.00 Серыял «Агонь кахання».**
**6.40** М/с «Арабела вяртаецца».
**7.05** «Цік-так».
**7.20** М/с «Смяшарыкі».
**8.30 Серыял «Ёхан ды Мар'я».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10 Маст. фільм «Год цяляці».**
**10.40** «Даведнік».
**11.10** Дак. фільм «Былыя пары».
**12.25 Серыял «Блізняты».**
**14.30** «Агульны інтарэс».
**15.25 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**17.00, 22.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**18.30** «Акцэнты».
**18.45 Серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».**
**21.25** Дак. фільм «Апошні жнівень Саюза».
**23.05 Маст. фільм «10 крокаў або менш».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «1000 дробязяў».
**15.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.55, 22.30 Серыял «Скліфасоўскі».**
**17.10 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».**
**18.00 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55 Серыял «Пацалуйце нявесту!».**
**20.40 Серыял «У зоне рызыкі».**
**23.40** «Прыстанак Святога Іосіфа».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**12.00, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Расплата».**
**23.30 Серыял «Глухар. Вяртанне».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.05, 18.35, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20** М/с.
**7.30 Серыял «Каралева-нявінніца».**
**9.05, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».**
**9.50 «Сінематограф». Маст. фільм «Рэбека».**
**12.10** Драма «К-19».
**14.20 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**16.10** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Тайныя сувязі».**
**18.40 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Фарсаж».**
**23.30** «Кінаблакнот».

### ВТБ

*6.00—8.00 Прафілактыка.*
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00** «Жонкі алігархаў».
**10.00, 19.00 Серыял «Метад Лаўровай».**
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00** Скетч-шоу «Адны дома».
**12.30** «Куды прыводзяць мары».
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Кадэцтва».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**20.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».**
**21.10 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».
**1.00** «PLAY».

### ІНТЭР+

*7.00—14.00 Прафілактыка*
**14.00, 18.20, 5.10 Серыял «Анёл-ахоўнік».**
**14.45, 6.45** Краіна смяецца.
**15.00, 0.40** Судовыя справы.
**15.40, 21.15, 5.50 Серыял «Цішыня».**
**16.45, 1.20** Сямейны суд.
**17.30, 4.15** Давай пажэнімся!
**19.05, 2.05** Дак. фільм «Вялікія ўкраінцы».
**19.35, 2.35** Код доступу.
**20.00, 3.00** Падрабязнасці.
**20.30, 3.30 Серыял «Запарогі». 1-я серыя.**
**22.20** Брама часу.
**22.50** Легенды бандыцкай Адэсы.
**23.20** Дак. фільм «Led Zeppelin. Рок ад А да Я».
**0.20** Феерыя падарожжаў.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2009 год.
**6.10** «Як гэта рабілася ў Адэсе?!». 1988 год.
**8.00** «Брава». Канцэрт.
**9.00** «Герцагіня Геральштэйнская». Спектакль. 1986 год.
**10.15** «Уладзімір Этуш». Юбілейны канцэрт у тэатры Вахтангава. 1993 год.
**11.00** «Поле цудаў». 1993 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Хіт-парад «Астанкіна». 1992 год.
**14.00** «Музыка і мы». 1987 год.
**15.20** «Немагчымы Бескаў». Дак. фільм.
**16.25** «Пакуль усе дома». 1994 год.
**17.00** «Кліч джунгляў». 1993 год.
**17.30** «АБВГДэйка». 1984 год.
**18.10** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**18.30 «Госця з будучыні», 1-я серыя. Маст. фільм.**
**19.35** «Спявае Кала Бельды». Фільм-канцэрт.
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Музычны рынг». 1989 год.
**23.00** «Камуналка». Дак. фільм.
**0.00** «Ранішняя пошта». 1985 год.
**0.35** «З робатамі не жартуюць». Фільм-спектакль.
**4.00** «Кінапанарама». 1970 і 1984 гг.

### EUROSPORT

**9.30** Бізнес-клас.
**9.35, 12.45, 19.50** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
**11.00, 14.00, 22.35, 1.00** Веласпорт. Энека тур.
**12.00, 18.30** Скачкі на лыжах. Летні Гран-пры.
**15.00, 16.30, 17.00** Хакей на траве. Чэмпіянат Еўропы.
**19.45** Sports Excellence.
**21.45** Вось гэта дзіва!!!
**22.00** Пра рэстлінг.
**23.00** Веласпорт. USA Pro Cycling Challenge.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 20.05** «Паміж намі».
**5.15, 5.35, 8.00, 8.25, 12.55, 2.20, 2.45** Серыял «Бэт!».
**6.00, 8.40, 10.40, 13.50, 23.50, 1.45, 3.10, 4.40** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «101 далмацінец».
**9.00** Камедыя «Салодкі як мёд».
**11.15** Камедыя «Баскетбольная ліхаманка».
**13.15, 16.00, 16.30, 21.00, 21.35** Серыял «Дваццаць Дванаццаць».
**14.05** Камедыя «Светлыя Каляды».
**17.20** Камедыя «Утаймаванне свавольнага».
**19.20** Камедыя «Хто такі гары Крамб?».
**22.10** Камедыя «Туз».
**0.10** Камедыя «Люблю цябе на ўсіх мовах свету».
**3.25** Камедыя «Параходны Біл-малодшы».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Фільм-казка «Новы Гулівер».
**3.05, 9.05, 15.05** М/с «Ну, пачакай!». Зборнік м/ф. «Мыйдадзір». «Танюша, Цяўка, Топ і Нюша».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Чорны пірат». Легенды і міфы старажытнай Грэцыі. «Геракл у Адмета». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Муха-цакатуха».
**5.00, 11.00, 17.00** Маст. фільм «Мама, я жывы». Зборнік м/ф. «Сіняя шапачка». «Вечныя льды». «Казка пра дурня Валодзю».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Легенда пра Зора».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Пераменка № 3». «Бяжы, ручаёк». «Выпадак на балоце».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.00, 18.30, 1.55** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.30** М/ф «Ледніковы перыяд 4: Кантынентальны дрэйф».
**15.00, 23.15, 3.30** Серыял «Менталіст».
**20.15** Серыял «Махляры».
**21.20, 4.20** Маст. фільм «Мы тут больш не жывём».
**0.10** Серыял «Звышнатуральнае».
**1.00** Серыял «Паляўнічыя на чужых».

### ТБ1000

**5.00** Камедыя «Прыезджыя».
**6.40** Трылер «Гульні патрыётаў».
**9.00** Драма «Кастрычніцкае неба».
**10.55** Драма «Авансцэна».
**13.00** Камедыя «Мексіканец».
**15.10** Дэтэктыў «Перакладчыца».
**17.25** Меладрама «Змяркание. Сага. Зацьменне».
**19.50** Трагікамедыя «Геніяльны тата».
**22.10** Драма «Злаві мяне, калі зможаш».
**0.45** Камедыя «Шоу Трумана».
**2.40** Трагікамедыя «Моцная жанчына».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Дэтэктыў «Сіняя барада».
**8.00** Драма «Нябесны суд».
**10.00** Камедыя «Алхімікі».
**12.00** Камедыя «Вусаты нянь».
**14.00** Камедыя «Гульня».
**16.00** Меладрама «Розыгрыш».
**18.00** Драма «Мінесота».
**20.00** Драма «Каўказская рулетка».
**21.40** Драма «Бубен, барабан».
**23.40** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**2.00** Баявік «Пуцявы абходчык».
**4.00** Драма «Бедуін».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Ліхтугі за мяжой.
**6.00, 10.00** Звяры-тытаны.
**7.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**8.00, 8.30, 16.00, 16.30** Шукальнікі скарбаў.
**9.00, 12.00, 17.00** Аўта-SOS.
**11.00, 19.00** Аферысты і турысты.
**13.00, 18.00, 23.00** Верталётныя баталіі.
**14.00** У пошуках гіганцкага васьмінога.
**15.00** Мядзведжы качэўнік.
**20.00, 0.00, 3.00** 80-я: Найвялікшыя трагедыі.
**22.00, 2.00** НЛА над Еўропай.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Хлопцы з Юкана.
**7.50, 8.15** Заводскія будні.
**8.40, 20.05** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.35, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 10.05, 17.20, 17.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30** Як уладкаваны Сусвет.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легендаў.
**12.20, 12.45, 3.05, 3.30** Вялізныя машыны.
**13.15, 0.55** Top Gear.
**14.10, 6.05** Аўтамайстэрні.
**15.05** Махінатары.
**15.30, 5.10** 80 спосабаў абагнуць зямны шар.
**18.15** Паўночная Амерыка.
**19.10** Лепшы рыбалоў
**21.00** Палёты ўглыб Аляскі.
**22.00** Паветраныя дальнабойшчыкі.
**23.00** Эд Стафард: голае выжыванне.
**0.00** Вайна ад першай асобы.
**1.50** Выкраданне і ратаванне.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

■ Пераход на «лічбу»

# ЭФІРНАЕ ВЯШЧАННЕ: ГАЛОЎНАЕ — РАЎНАМЕРНАСЦЬ

**Абсалютная большасць беларусаў цярпліва чакае 2015 года, калі айчыннае тэлебачанне канчаткова пяройдзе на лічбавае эфірнае вяшчанне. Тым часам жыхары Асіповічаў ужо маюць гэтую асалоду: іх радуе высокая якасць выявы і гуку пры праглядзе ўлюбёных перадач. Пра вышэйпералічаныя плюсы лічбавага тэлебачання, а таксама пра асаблівасці вяшчання ў Асіповічах чытаем ніжэй.**

## Не адкладвайце на заўтра

Паводле слоў Паўла Петрулевіча, кіраўніка ўпраўлення электрасувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, адна з асноўных праблем — наяўнасць прыёмных прыстасаванняў у насельніцтва. Для прыёму эфірнага лічбавага сігналу неабходна тэлевізійная прыстаўка, якая падтрымлівае фармат DVB-T, або тэлевізар гэтага фармату. «Калі пытанні тэхнічнага характару (будаўніцтва новых радыётэлевізійных перадавальных станцый, фарміраванне і перадача лічбавага сігналу) мы маглі вырашыць без асаблівых праблем, то забяспечыць тэхнічнымі прыстасаваннямі... Гэта абавязак насельніцтва...» Жыхары Асіповічаў павінны былі самастойна паклапаціцца пра наяўнасць у сваіх дамах да моманту адключэння аналагавага вяшчання спецыяльнага абсталявання. «Той, хто хацеў прымаць эфірнае лічбавае тэлебачанне, не чакаў апошняга моманту, а рыхтаваўся загадзя. Што датычыцца неабароненых катэгорый беларусаў, то мясцовыя органы ўлады зрабілі ўсё магчымае, каб ім дапамагчы», — запэўнівае кіраўнік упраўлення электрасувязі.

Вядома ж, папярэдне спажыўцоў анкетавалі. «Каля 80% ведала пра адключэнне першага жніўня аналагавага вяшчання», — канстатуе Павел Петрулевіч. «Для пэўнай часткі жыхароў адключэнне аналагавага вяшчання фактычна зусім прайшло незаўважна. Чаму? Як правіла, большая частка жыхароў Асіповічаў мае кабельнае тэлебачанне».

Станоўчыя аспекты лічбавага тэлебачання — высокая якасць малюнка і гуку. Лічбавае тэлебачанне дае магчымасць перадаваць выявы высокай выразнасці (або HDTV) са шматканальным гукавым суправаджэннем, а таксама ў перспектыве стэрэамалюнка (3D). Лічбавы сігнал у меншай ступені схільны да ўплыву перашкод. Для параўнання, там, дзе аналагавае тэлебачанне ідзе з шумам, лічбавы сігнал прымаецца ў той якасці, у якой ён быў сфарміраваны ў тэлевізійнай студыі.

Павел Петрулевіч наконт HD гаворыць наступнае: «Спіс праграм агульнадаступнага пакета складае 8 рэспубліканскіх каналаў. Усе іх перадачы транслююцца ў стандартнай якасці (SD). Аднак сёння рэалізуецца і праект камерцыйнага лічбавага вяшчання, дзе разглядаецца магчымасць вяшчання каналаў у HD якасці. Пытанне вызначае патрэба насельніцтва ў гэтым».

Што датычыцца кабельных сетак, то многія з аператараў маюць пакеты, якія дазваляюць трансляваць у тым ліку і HD каналы. Зусім іншая справа — наколькі такое запатрабавана сярод беларусаў. Кошт кантэнту ў HD якасці мае цану больш высокую...

«Вяшчанне з падтрымкай HD залежыць не толькі ад гатоўнасці перадавальнай сеткі, але і ад кантэнту, які даюць тэлестудыі. Будзе попыт — будзе і такая паслуга», — лічыць Павел Петрулевіч. «Так ці інакш, калі абанент мае прынцыповую патрэбу ў трансляцыі з HD якасцю, ён можа звярнуцца да свайго аператара. Апошні абавязкова адкажа, калі ў дамах кліентаў з'явяцца такія каналы».

**Адна з асноўных праблем — наяўнасць прыёмных прыстасаванняў у насельніцтва. Для прыёму эфірнага лічбавага сігналу неабходна тэлевізійная прыстаўка, якая падтрымлівае фармат DVB-T, або тэлевізар гэтага фармату.**

Ці значыць гэта, што ў бліжэйшы час тэлевізар пераўтворыцца ў адчыненае акно, а гук стане такім, які ў кінатэатры? Калі аператар вяшчае пэўную праграму ў HD якасці, то, хутчэй за ўсё, і шматканальны гук вам забяспечаны. Але неабходна памятаць, што і ваш тэлевізар павінен падтрымліваць шматканальны гук. Не апошняя роля належыць акустычнай сістэме.

## Добры сігнал і для аддаленых вёсак

Адзін са значных плюсоў — устойлівасць да перашкод. Упэўнены прыём сігналу забяспечаны не толькі гарадскому насельніцтву, але і аддаленым вёскам.

Паводле слоў кіраўніка ўпраўлення электрасувязі, з 2005 года актыўна рэалізуецца дзяржаўная праграма па лічбавым тэлевізійным вяшчанні. Сёння створаны ўмовы для прымання лічбавага сігналу на тэрыторыі пражывання каля 96% беларусаў. Ужо цяпер эксплуатуецца 66 радыётэлевізійных перадавальных станцый. Да канца 2015 года будзе пабудавана яшчэ каля трыццаці. Такім чынам, амаль уся тэрыторыя будзе пакрыта лічбавым тэлевізійным вяшчаннем ужо праз два гады.

«Вядома, часам узнікаюць асобныя праблемы наконт якасці, — адказвае Павел Петрулевіч, — але нашы аператары пастаянна рэагуюць. Дастаткова паведаміць пра цяжкасці, каб адразу ж прааналізавалі канкрэтныя станцыі. Мы заўсёды высветлім, чаму і як».

Дзякуючы дасягненням у сферы мікраэлектронікі ствараюцца ўмовы, каб знізіць энергетычнае спажыванне. Адзін лічбавы перадавальнік стандарту DVB-T замяняе 8 аналагавых, што дае магчымасць значна сэканоміць электраэнергію, а таксама вызваліць частотны рэсурс для іншых паслуг.

Хто ж наступны? Жлобін, Ясны Лес (Бабруйск) і Касцюковічы. А далей справа расцягнецца на два гады па ўсёй тэрыторыі. Галоўнае — раўнамернасць.

*Каб вырашыць пытанні, звязаныя з пераходам на эфірнае лічбавае тэлевізійнае вяшчанне, Міністэрства сувязі прапануе звярнуцца да спецыялістаў адзінай бясплатнай даведачна-інфармацыйнай службы «172». Супрацоўнікі апошняй растлумачаць цяжкасці, прапанаваўшы шляхі вырашэння. Званкі са стацыянарнай тэлефоннай сеткі бясплатныя.*

**Маргарыта СІДАР.**

# «АПОШНЮЮ ПРЫСТАЎКУ ЗАБРАЛІ НА МІНУЛЫМ ТЫДНІ, А ЛЮДЗІ ЎСЁ ІДУЦЬ...»

**Сёлета ўсё часцей і часцей аб'ектам сямейных размоў на кухні становіцца лічбавае тэлебачанне. Падчас сняданку ці вячэры ўздымаецца актуальнае пытанне, як па чарнышэўскаму: «што рабіць?» Калі ж быць больш дакладнымі, то... Колькі грошай збіраць? Куды ісці? Як выбіраць і што купляць? І, вядома ж, анікому з беларусаў не хочацца памыліцца, бо памылкі заўжды каштуюць дорага. Каб істотна спрасціць жыццё нашым чытачам, карэспандэнт «Звязды» выпраўляецца ў шлях па сталічных крамах. Нас чакаюць пяць найбуйнейшых гандлёвых пунктаў. Што ж... Не губляем ніводнай хвіліны!..**



Пакуль чырвоным маркерам малюем маршрут, Мінск паволі прачынаецца, а ў нашых думках спее грандыёзная ідэя. Ці чулі вы калі-небудзь пра «метад маскі»? Не, мы зусім не плануем пераўвасабляцца ў прадстаўнікоў іншых прафесій. Проста абмяжуемся займальнай гісторыяй для кансультантаў у крамах, якія несумненна будуць пытацца пра нашы мэты.

## Жартуем пра бабулю

Плошча Якуба Коласа. Менавіта тут знаходзіцца першая кропка на нашым маршруце. Заходзім, азіраемся навокал у царстве бліскучых экранаў. Сярод пакупнікоў яскравымі плямамі мільгаюць вішнёвыя кашулі ахоўнікаў і кансультантаў. Самы час злавіць каго-небудзь з апошніх: «Добры дзень. Гэта вы мне адкажаце на ўсе пытанні пра тэлевізары, так? О, цудоўна! Слухайце. У мяне такая праблема. Бабуля сямідзесяці гадоў не ведае, як ёй далей жыць. Пачула пра пераход на лічбавае эфірнае вяшчанне, і цяпер хваляванню няма межаў». Малады кансультант здзіўлена падымае левае брыво, а затым расплываецца ў шчырай усмешцы: «Гм... А які тэлевізар у вашай бабулі?» Праз дзесяць хвілін мы ведаем ледзь не ўсё асноўнае. Калі ў тэлевізары ёсць скарт (шырокі раз'ём), дастаткова дакупіць прыстаўку (у гэтай краме яна, расійскай вытворчасці, каштуе 380 тысяч). Калі ж раз'ёму няма, трэба набыць новы тэлевізар. Кансультант прапаноўвае два бюджэтныя варыянты за 2,5 і 3 мільёны рублёў: першы — Horizont, другі — Samsung. Абедзве мадэлі цяпер стаяць на акцыі. Дарэчы, пра акцыі: «А ці ёсць у вас спецыяльныя зніжкі для кліентаў? Скажам, хутка ў бабулі чарговы дзень народзінаў... Вы ж абавязаны зрабіць ёй маленькі падаруначак?» Малады чалавек ужо паціху ўсміхаецца. «Так. Безумоўна. Мы скінем 3%, але папярэдне гэта неабходна ўзгадніць з адміністрацыяй», — паведамляе ён, а затым падмігвае: — Мы ж за справядлівасць». Так, яны ж за справядлівасць. Тым не менш на паўторнае пытанне пра цану на прыстаўкі кансультант адказвае, што якасную трэба набываць за 800 тысяч. Ужо ў дзвярах крамы на наш адрас далятае вясёлае: «Будзем чакаць вас і вашу бабулю, калі яна адважыцца на сур'ёзную пакупку».

## Зрабілі з камара каня

Набліжаемся да Камароўскага рынку. Паблізу размясцілася другая цікавая для нас крама. Нас сустракае жанчына сярэдніх гадоў. Выслухаўшы пытанні, яна пачынае цвёрда і вельмі канкрэтна. Апошнюю прыстаўку забралі на мінулым тыдні, а людзі ўсё ідуць і ідуць. Кожны дзень па дзесяць чалавек звяртаецца наконт пераходу на «лічбу». «Так, я магу паказаць танныя тэлевізары. Вось Horizont за 2 мільёны 650 тысяч і 2 мільёны 750 тысяч адпаведна (калі дыяганаль 22 цалі). Хочаце больш прывабны варыянт? Калі ласка. Horizont за 3 мільёны 199 тысяч. Так, гэта апошнія мадэлі. Ведаеце, зараз пытанне тэлевізараў неймаверна актуальнае. А чаго ж вы хочаце? Больш як 60% беларусаў карыстаецца старымі». Спраўны кансультант зноў вяртаецца да тэмы прыставак. Паводле яе слоў, усе дзяржаўныя крамы гандлююць або кітайскай прадукцыяй фірмы BBK (за 300 тысяч), або айчыннай фірмы Skytech (за 451 тысячу). Праз хвіліну жанчына ставіць праблему: «Але вы ж разумееце, што ўсе нашы прыстаўкі разлічаны на эфірнае вяшчанне? Гэта, як правіла, 7 каналаў, у выпадку ўзмоцненага сігнала — 14. А кабельнае? Няўжо яго пераход на «лічбу» цалкам забяспечаць пастаўшчыкі самой паслугі? Вось у Еўропе дакладна так і зрабілі. А ў нас... Адно магу канстатаваць упэўнена: пакуль у гандлёвы цэнтр прыставак для кабельнага тэлебачання не завозілі». Апошні факт выклікае непаразуменне: «І што? Няўжо наша бабуля не зможа сачыць за сюжэтамі ўлюбёных серыялаў на канале «Рамантыка» або засынаць вечарамі пад фільмы жахаў на «TV 3»?»

## «НТБ» камандуе парадам

З вышэйакрэсленай праблемай накіроўваемся ў суседнюю краму. Адчыняем дзверы і адразу ж бачым добра знаёмыя прыстаўкі, цёмныя корпусы якіх блішчаць за шклом. Застаецца пачакаць, пакуль малады чалавек з бэйджыкам скончыць тлумачыць штосьці пра пульты адной вельмі дапытлівай жанчыне. Вось ён ужо вітае нас прафесійнай усмешкай кансультанта. Самы час паўтарыць і яму займальную гісторыю пра бабулю. «Старажытны кінескопны тэлевізар? — перапытвае ён. — Цяпер гэта надзённа. З'явіліся людзі, якія гатовы іх набыць. Таму такі цуд тэхнікі трыццацігадовай даўнасці прадаць вы зможаце». «Прадаць? Каму ён патрэбны?» — не ўтойваем здзіўлення ў голасе. І кансультант адразу ж падае ідэю завітаць на пэўны сайт, дзе ажыццяўляюцца такога кшталту аперацыі. А яшчэ раіць знайсці арганізацыі, супрацоўнікі якіх прыедуць да вас дахаты, забяруць старэнькі тэлевізар і, вядома ж, выплацяць пэўную кампенсацыю. Добра, цяпер высвятляем пытанне з «Рамантыкай» і «TV 3». Праз хвіліну мы ўжо разумеем: у папярэднім гандлёвым цэнтры з камара каня зрабілі, бо аніякай праблемы і з кабельным тэлебачаннем быць не можа. Першая ж прыстаўка, якую прапаноўвае кансультант, універсальная: і эфірнае, і кабельнае лічбавае вяшчанне гарантавана. А яшчэ забяспечана падтрымка высокага дазволу адлюстравання. Каштуе гэтая асалода 420 тысяч. Калі ж вам дастаткова эфірнага тэлебачання, то можна абысціся і 320 тысячамі. Пералічаныя прыстаўкі пастаўляюцца ўсё той жа айчыннай фірмай Skytech. Ёсць і іншы варыянт: можна набыць прыстаўку кітайскай вытворчасці фірмы TV Star. Гэтая тэхніка каштуе даражэй. Праўда, кансультант настойліва раіць купляць менавіта беларускае: цана меншая, упэўненасць у якасці большая. Падчас размовы ўзнікае прынцыпова новы момант. «А ці ідзе ў вашай бабулі канал «НТБ»?» — цікавіцца кансультант. «Апошнім часам не ідзе. Бабуля скардзіцца, што не можа глядзець перадачу «Надзвычайнае здарэнне». Гаворыць, ужо столькі цікавага прапусціла. А якое дачыненне «НТБ» мае да нашай тэмы?» Як выявілася пасля, дачыненне тут самае прамое: калі ідзе — то ўсё нармальна, а калі не — трэба купляць антэну. Самыя папулярныя — антэны фірмы «Дэльта», якія каштуюць 257 тысяч. У гэтым выпадку сэканомяць жыхары не вельмі аддаленых беларускіх вёсак, дзе паблізу ёсць рэтранслятар. Тады можна абмежавацца антэнай за 158 тысяч. Далей шукаем тэлевізары і прыходзім да высновы: цэны ўсюды падобныя (2 мільёны 500 тысяч і 2 мільёны 750 тысяч — кошт самых танных з усіх магчымых варыянтаў). Калі ж ваш «залаты запас» больш чым дастатковы, то вы смела можаце набыць адну з мадэляў тэлевізараў Filips. Дарэчы, фірма на крок апярэджвае астатнія ў плане дызайну, выпускаючы прадукцыю белага колеру.



## Сямейная ідылія

Перамяшчаемся на праспект Незалежнасці. «Звяртайцеся — мы дапаможам» гаворыць надпіс на спінах супрацоўнікаў гандлёвага цэнтра. Што ж... Грэх не звярнуцца, праўда? Першы кансультант у чырвонай футболцы накіроўвае нас да іншага, бо сам ён можа адказваць на пытанні пра чайнікі, але ніяк не пра тэлевізары. А вось і невялікая праблема: тэлевізійны спецыяліст кудысьці знік у пошуках чагосьці. Мужчына, што стаіць поруч, ужо не ўтойвае раздражнення: «Я яго паўгадзіны чакаю». Пасля да раздражнёнага кліента падыходзіць жонка з дачкою: «Ігар, я тваю маму пераканала купіць чайнік». А затым з'яўляецца і сама мама нецярплівага пакупніка. Яна, шчаслівая, задаволена трымае запакаваную скрыню: «Ігар. Паглядзі, чайнік купіла. Я даўно новы хацела». Вось такая сямейная ідылія. Яшчэ колькі часу — і мы ўжо размаўляем з доўгачаканым кансультантам. «Не, прыставак няма. Раскупілі. Новых не завезлі. Так, ёсць бюджэтныя тэлевізары за 3 мільёны 99 тысяч фірмы LG. Можаце запісваць на флэшку фотаздымкі, відэа, а пасля праглядаць на экране. Хаця... Вы кажаце, што для бабулі... Яшчэ ёсць класны тэлевізар за 6 мільёнаў 999 тысяч беларускіх рублёў». Усё зразумела.

### Парады «Звязды»

*Уважліва сачыце, каб колькасць пікселяў вашага будучага тэлевізара не была меншай за 1920:1080.*

*Найлепшая падсветка — святлодыёдная. Яна абазначаецца літарамі LED.*

*Абавязкова павінна быць пазнака пра наяўнасць лічбавага цюнара (пазначаецца як DVB-T).*

*Памятайце, лепш выбіраць тэлевізар з вадкакрышталічным экранам. Плазменны экран, хоць і адрозніваецца павышанай яскравасцю фарбаў, «з'ядае» шмат электраэнергіі.*

## Па сакрэце ўсяму свету

Праспект Машэрава. Гандлёвы цэнтр амаль пусты. За касай — дзяўчына з выразам твару, што адлюстроўвае сум усіх часоў і народаў. А вось кансультант выглядае вельмі жвавым. «Так, у нас ёсць прыстаўкі. Rolsen — ад 240 тысяч, BBK — ад 280, TV Star — ад 420. Першыя дзве разлічаны выключна на эфірнае тэлебачанне. Яшчэ ёсць універсальная прыстаўка «Віцязь» за 690 тысяч. Адкрыю вам невялікі сакрэт: у чатырох пакупнікоў яна «не пацягнула» кабельнае тэлебачанне. З эфірным жа ўсё цудоўна». На палічках стаяць тэлевізары LG (3 мільёны 400 тысяч), Horizont (3 мільёны 570 тысяч), Samsung (3 мільёны 750 тысяч), Panasonic (3 мільёны 900 тысяч). Далей размяшчаюцца вельмі дарагія мадэлі. «Спадзяёмся, ваша бабуля аддасць перавагу нашаму цэнтру», — усміхаецца жвавы кансультант.

Зноў выходзім на праспект Машэрава, разумеючы: на гэтым тэлевізійны шопагляд скончаны. Маршрут пройдзены ўдала. Алгарытм дзеянняў таксама відавочны, і чарнышэўскае «што рабіць?» больш не здаецца такім невырашальным. Разумеем, дзесьці можна сэканоміць, дзесьці — не паскупіцца і на заморскі варыянт. Так ці інакш, права выбару заўжды за вамі.

**Маргарыта СІДАР**

■ Газета «Звязда»+www.doktora.by

# ЗВЯРТАЕМСЯ ДА ХІРУРГА

**На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by і чытачоў газеты «Звязда» адказала загадчыца хірургічнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна МІХАЙЛАВА.**

— **Аляксандр, 27 гадоў.** ***Ударыў правае калена. Прайшоў курс фізіялячэння (магніт, азакерыт і інш.). Заключэнне МРТ: карціна траўматычнага пашкоджання структур правага каленнага сустава (з пераважна задніх рагоў абодвух меніскаў з прыкметамі разрыву) + пярэдняй крыжападобнай звязкі (прыкметы субтатальнага разрыву) + участкаў унутрыкоснага ацёку ў праекцыі сцегнавой бярцовай косці (верагодна, як вынік трансхандральнага пашкоджання) + умерана выражанага сінавіту. Ці патрэбна ў гэтым выпадку аперацыя?***

— Так, аперацыя неабходна. Вам паказана артраскапія для выдалення ўчасткаў траўмаванага меніска і праўдзення пластыкі крыжападобнай звязкі.

***— Тры дні таму ўкалола ў каленны сустаў дыпраспан. Спачатку стала лягчэй, боль знік, але хруст і пухліна засталіся. Суставы «выкручвае». Праз які час дзейнічае дыпраспан і што рабіць, калі з'яўляюцца пабочныя эфекты?***

— Эфект ад увядзення дыпраспану звычайна надыходзіць праз 48-72 гадзіны. Пабочныя эфекты праяўляюцца ў залежнасці ад сімптомаў. Наогул дыпраспан не з'яўляецца базавым прэпаратам для лячэння астэаартрозу. Магчыма, вам неабходны працяглы прыём хондрапратэктараў з дабаўленнем фізіятэрапеўтычнага лячэння. Далейшае ж увядзенне дыпраспану немэтазгоднае.

***— Мне 37 гадоў. З 23 гадоў пастаянна ныюць калені. Хварэла на хламідыёз. У дзяцінстве былі частыя ангіны. Дыягназ ставіць не жадаюць: маладая для артрозу. Ультрагук паказаў пад каленямі дзве кісты, але траўмаў у мяне не было. Другі ўрач сказаў, што гэта вадкасць і яе трэба выдаліць лазерам. Пасля 10 працэдур боль не знік, а толькі крыху зменшыўся. У абласной паліклініцы прызначылі электрапраграванне з гідракартызонам. Востры боль, які мучыў пасля лазера на ўнутраным баку нагі ў раёне калена, амаль прайшоў, але праблема 15-гадовай даўніны засталася: калі падыму крыху больш за 5-7 кг, то праз пару гадзін — моцны боль. Праходзіць пасля працяглых націрання ў. Аднак дыскамфорт ёсць заўсёды, асабліва ноччу. Што рабіць?***

— Калі ўлічыць перанесеныя захворванні, то вам неабходна кансультацыя ўрача-рэўматолага, які паставіць дыягназ і прызначыць комплекснае лячэнне. Дыягназ астэаартрозу ў вашым узросце ставяць даволі часта. Наогул пры вызначэнні з лячэннем спецыяліст павінен улічыць асаблівасці вашай работы, вашу вагу, прыём гарманальных прэпаратаў і інш.

***— Мне 62 гады. Дыягназ — гонартроз 2-й ступені левага каленнага сустава і 3-4-й ступені — правага. Рабілі рэнтген і ўльтрагук. З правым суставам стаю ў чарзе на пратэзаванне. Востры боль падчас хады, калені апухаюць, як і ўся правая нага. Маю лішнюю вагу (114 кг), варыкознае расшырэнне на правай назе, хварэю на цукровы дыябет 13 гадоў. Атрымаў з Германіі гамеапатычны сродак Traumetl у ампулах. Мне параілі пакалоць, каб зняць боль і ацёчнасць. Што параіце? Куды рабіць уколы і як часта?***

— Прэпарат траўмель, як многія іншыя гамеапатычныя сродкі, не ўваходзіць у арсенал паўсядзённых прызначэнняў урача траўматолага-артапеда. Трэба разумець, што вынік ад прымянення гэтага прэпарата індывідуальны. Рэкамендуецца да 20 ін'екцый: 10 унутрысустаўна і 10 унутрымышачна. Калі ж улічыць вашу спадарожную паталогію, то спадзявацца на выдатны вынік не даводзіцца. Трэба імкнуцца знізіць вагу, паколькі гэта, як, дарэчы, і цукровы дыябет, можа стрымліваць хірургаў ад актыўнай хірургічнай тактыкі. Ніякі эндапратэз не праслужыць доўга пры вазе 114 кг, аперацыя ж вельмі траўматычная. Звярніцеся да ўрача-хірурга і па прычыне лячэння паталогіі сасудаў.

***— У 1986 годзе паставілі дыягназ: двухбаковы прыроджаны вывіх сцёгнаў. Каля 4 гадоў праляжала ў бальніцы, перанесла некалькі аперацый. Пасля выпіскі выконвала ўсе рэкамендацыі ўрачоў — фізіяпрацэдуры, масаж, плаванне і г.д. Летась па выніках чарговага здымка паставілі дыягназ — асэптычны некроз абедзвюх галовак сцегнавых касцей. Якія існуюць метады лячэння гэтага захворвання?***

— У будучым, калі з'явяцца тэхнічныя магчымасці, з улікам перанесеных аперацый, вам паказана татальнае эндапратэзаванне тазасцегнавых суставаў. Зараз неабходна тэрапія-падтрымка: хондрапратэктары курсамі, сасудзістыя прэпараты, масаж спіны і ніжніх канечнасцяў, лячэбная фізкультура, санаторна-курортнае лячэнне.

— **Дзіяна, 21 год.** ***У сакавіку зламала шчыкалатку. Дыягназ — закрыты, аскольчаты пералом унутранай шчыкалаткі, задняга краю вялікай галёначнай косці, вонкавай шчыкалаткі малой галёначнай косці правай галёнкі са змяшчэннем адломкаў. Пашкоджанне правага галёнкаступнёвага сустава, падвывіх ступні. Шчыкалатку ўпраўлялі пад наркозам. Сказалі, што ўпраўлена добра. На здымку ўсё ў парадку. Праз 7-10 дзён трэба рабіць здымак, каб пераканацца, што няма змяшчэння. Зараз нага падпухла, часам боль моцны. Прымаю кетарол у таблетках. Ці лічыцца нормай наяўнасць апухласці і болю? Якія абязбольваючыя лепш прымаць? Як доўга давядзецца быць у гіпсе?***

— Вы зламалі, як кажуць траўматолагі, тры шчыкалаткі. З улікам наяўнасці падвывіху стапы і цяжкасці атрыманай траўмы, ацёк — нармальная з'ява. Прэпарат кетарол вельмі часта і абгрунтавана прызначаецца пры гэтай паталогіі. Можна выкарыстоўваць ін'екцыйную форму. Калі ацёк працягвае нарастаць, боль гэтым прэпаратам не знімаецца, неабходна кансультацыя хірурга, паколькі пры імабілізацыі можа развівацца тромбафлебіт павярхоўных і нават глыбокіх вен. Імкніцеся нагу трымаць прыўзнятай. Працягласць імабілізацыі залежыць ад таго, як хутка будзе зрастацца ваш пералом. Пры гэтым будуць выконвацца кантрольныя здымкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# ЛЕКІ З МАЛАКА АД СПЕЦЫЯЛЬНЫХ КОЗ

**Адзін час «зоркамі» тэлеэкрана сталі... козлікі і козачкі. З выгляду звычайныя, беленькія, рухавыя гарэзы. На самай жа справе падобныя яны да іншых толькі знешне. Гэта першыя ў рэспубліцы, ды і на прасторах СНД, трансгенныя дробнарагатыя жывёліны. Выведзены яны не дзеля павышэння малочнай ці мясной прадуктыўнасці.**

А для чаго ж тады? Дзеля атрымання... лекаў, якія не маюць пабочных для чалавека эфектаў. Справа ў тым, што вучоныя Інстытута біялогіі гена АН РФ здзейснілі сапраўдны прарыў у стварэнні асобай геннай канструкцыі. Ёй няма роўных у свеце. Тэхналогія адкрыла рэальныя перспектывы атрымання лактаферыну чалавека.

«Хіміі» ў прамым і пераносным сэнсе мы ўжо нахапаліся даволі. Яна прысутнічае амаль у кожнай мікстуры. Больш за тое, да яе маюць уласцівасць прызвычайвацца самыя старыя доўгажыхары Зямлі — мікраарганізмы. Яскравы прыклад таму адкрыццё і атрыманне такога антыбіётыка, як пеніцылін. Сотні тысяч раненых у гады Вялікай Айчыннай вайны абавязаны вяртанню да жыцця менавіта гэтаму вынаходніцтву. Аднак з цягам часу з'явілася ўстойлівасць да антыбіётыкаў і прыстасаванасць мікрафлоры да гэтага і шэрагу іншых лекавых прэпаратаў.

Таму вучоныя многіх краін скіравалі свае пошукі ў барацьбе з хваробамі на стварэнне лекаў на аснове прыродных бялкоў. Праблемы ў тым, каб выбраць такі бялок, які б валодаў высокім бактэрыялагічным дзеяннем, каб не адбывалася да яго адаптацыя патагенных мікраарганізмаў, каб ён актывізаваў імунітэт і быў абсалютна бясшкодны. І такі ўніверсал ёсць. Імя яму лактаферын. Знаходзіцца ён у малозіве, малацэ, сываратцы крыві, лейкацытах. Паводле сцвярджэння спецыялістаў, гэта адзіны від бялка, які валодае бактэрыястатычным і бактэрыцыдным дзеяннем. Ён нагадвае механізм работы антыбіётыкаў. Толькі шкодзіць не толькі бактэрыям, але і клеткам арганізма чалавека. Лактаферын жа не дапускае вірусныя часцінкі да клетак, садзейнічае знішчэнню шкодных бактэрый.

Упершыню лактаферын быў выяўлены і выдзелены з малака кароў яшчэ ў 1939 годзе, а потым у 1960 годзе і з малака кормячых маці. Аднак шырокага практычнага прымянення ён не знайшоў, акрамя як харчовых дабавак.

Сёння ў многіх краінах вядзецца інтэнсіўнае вывучэнне атрымання рэкамбінантнага лактаферыну біятэхналагічнымі метадамі з выкарыстаннем жывых аб'ектаў: раслін, мікраскапічных грыбкоў, млекакормячых і клетачных сістэм.

Расійскія і беларускія вучоныя ў пачатку новага стагоддзя паставілі перад сабой мэту выдзеліць лактаферын з малака коз. Чаму іменна гэтых капытных? Тут пераплятаюцца біялагічны і эканамічны фактары. Козы хутка размнажаюцца, якасць малака найбольш адпавядае патрабаванням, самі яны не з'яўляюцца носьбітамі небяспечных для людзей інфекцый. Плюс і тое, што ўтрыманне і догляд іх не выклікае вялікіх выдаткаў. Вось і была прынята праграма «БелРасТрансген» на 2003—2007 гады, а потым і працягнута да 2013 года. Фінансавалася яна з бюджэту Саюзнай праграмы.

Паколькі Інстытут біялогіі гена Расійскай акадэміі навук ужо меў пэўныя тэарэтычныя напрацоўкі, за НПЦ НАН Беларусі па жывёлагадоўлі стаяў практычны бок справы. У выніку мноства (звыш 500) складаных мікрахірургічных аперацый і былі атрыманы першыя козлікі Лак-1 і Лак-2 (дагэтуль яны здаровенькія, бадзёра падбрыкваюць) з генам лактаферыну чалавека ў сваім геноме.

Гэтыя чатырохногія жыўчыкі распладзіліся, маюць 112 дачок — цэлы статак. Козачкі разам з малаком прыносяць лактаферын у сярэднім па 5 грамаў на кожны літр, а некаторыя ўдвая больш. Навукова-даследныя інстытуты медыцынскага профілю абедзвюх краін пацвердзілі адпаведнасць лактаферыну прыроднаму бялку па ўсіх характарыстыках. Цяпер справа за яго прамысловай вытворчасцю. Гэты ўнікальны шматфункцыянальны бялок незаменны не толькі ў фармакалогіі і медыцыне, але і ў харчовай галіне, касметалогіі, спорце.

— Значыць, ён патрэбны ў немалых аб'ёмах, — гаворыць генеральны дырэктар РУП «НПЦ НАН Беларусі па жывёлагадоўлі», заслужаны работнік сельскай гаспадаркі рэспублікі Мікалай Папкоў. — Таму мы будуем ферму для прадуктыўных коз на 250 галоў, ствараем спецыялізаваную высокатэхналагічную ўстаноўку (цэх) па прамысловым выдзяленні з казінага малака лактаферыну высокай чысціні. Скажу шчыра: задача аказалася не такой простай, як здавалася спачатку. Аналагаў жа няма. Даводзіцца весці шматварыянтны навуковы тэхналагічны і тэхнічны пошук. Яшчэ раз пераканаліся, што праблему можна вырашыць толькі сумеснымі намаганнямі з расійскімі калегамі. Яны сур'ёзна рушылі наперад, у іх больш магутная навукова-матэрыяльная база.

Закладзеныя параметры ў дзвюх папярэдніх праграмах «БелРасТрансген» паспяхова рэалізаваны. На чарзе наступная «БелРасФарм» да 2018 года, лагічны працяг папярэдніх. Спыняцца ні ў якім разе нельга. І не толькі таму, што канкурэнты могуць абагнаць. Гаворка ж пра самае дарагое — здароўе людзей. Прамысловая фармацэўтычная вытворчасць біялагічна бяспечных і высокаэфектыўных лекавых прэпаратаў новага пакалення, функцыянальных харчовых прадуктаў для дзяцей і дарослых на аснове лактаферына з'яўляецца жыццёва неабходнай. Да таго ж нельга ігнараваць і экспартную магчымасць.

**Мікалай ШЛОМА.**

# ДА ВОСЕНЬСКАГА СЕЗОНА Ў БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ АДКРЫЮЦЬ 14 НОВЫХ ГРЫБАВАРНЫХ ПУНКТАЎ

**Каапėратары Брэсцкай вобласці да восеньскага сезона адкрыюць 14 новых грыбаварных пунктаў. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміла першы намеснік старшыні праўлення Брэсцкага абласнога саюза спажывецкіх таварыстваў Таццяна Чэрапава.**

Рыхтуючыся да масавай нарыхтоўкі грыбоў, кааператары аднаўляюць працу ўжо існуючых пляцовак і адкрываюць новыя. Цяпер у сістэме аблспажыўсаюза налічваецца 21 грыбаварны пункт. Плануецца, што да адкрыцця восеньскага сезона іх колькасць павялічыцца да 35. Так, у Пружанскім райпа замест аднаго стане чатыры грыбаварныя пункты. На столькі ж павялічыцца іх колькасць у Кобрынскім раёне, з трох да пяці — у Баранавіцкім раёне. «Грыбы трэба варыць там, дзе яны растуць. Мы патрабуем ад нашых райпа арганізаваць гэтыя пляцоўкі бліжэй да людзей, а не ў кавярнях у райцэнтры. У кожным раёне ўжо вызначаны па тры-чатыры такія зоны», — адзначыла Таццяна Чэрапава.

Цяпер ідзе падрыхтоўка новых пляцовак: завозіцца неабходнае абсталяванне для прыёмкі і перапрацоўкі грыбоў, будуюцца спецыяльныя навесы, адшукваюцца грыбавары. «Каб зацікавіць людзей, мы ўстанавілі павышаныя расцэнкі за пераборку, мыйку і варку грыбоў. Гэта цяжкая праца. Нярэдка на падворку, дзе знаходзіцца пункт, працуе ўся сям'я грыбавара», — адзначыла суразмоўца.

Сёлета кааператары рэгіёна плануюць падвоіць аб'ём нарыхтоўкі грыбоў і давесці яго да 105 тыс. т. Вялікія надзеі ўскладаюцца на асеннія груздзы, апенькі, масляткі, польскі грыб. Белыя грыбы, па назіраннях спецыялістаў, насельніцтва, як правіла, лічыць за лепшае пакідаць сабе. Па выніках мінулага года больш за ўсё грыбоў было нарыхтавана Баранавіцкім і Івацэвіцкім райпа — 38 т і 11 т адпаведна. Пры гэтым практычна пятая частка прадукцыі ў салёна-адвараным і замарожаным выглядзе была адгружана на экспарт.

Акрамя таго, па словах першага намесніка аблспажыўсаюза, кааператары сталі больш актыўна выкарыстоўваць дары лесу ў кухні сваіх прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Ужо сёння ў меню многіх каапėратыўных кавярняў і рэстаранаў вобласці прысутнічаюць грыбны суп, смажанка з грыбоў, бульба тушаная з грыбамі, груздзы з часнаком і смятанай.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Рапс»

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Рапс» (Республика Беларусь, Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20).

**Наименование предмета аукциона:**

- **здание склада (инвентарный номер 641/С-10210)**, общая площадь 761,3 кв. метров; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; год постройки – 1965; фундамент – ленточный бутобетонный; стены кирпичные; перекрытия чердачные – деревянные стропила; крыша – асбестоцементные листы; полы – бетонные; проемы оконные – нет; проемы дверные – ворота дощатые; наружная отделка цоколя – нет; наружная отделка стен – оштукатурено; внутренняя отделка – без отделки; инженерное оборудование – нет (вентиляция – естественная вытяжная); общее техническое состояние удовлетворительное;

- **здание склада (инвентарный номер 641/С-10211)**, общая площадь 755,1 кв. метров; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; год постройки – 1970; фундамент – ленточный бутобетонный; стены кирпичные; перекрытия чердачные – деревянные стропила; крыша – асбестоцементные листы; полы – бетонные; проемы оконные – деревянные остекленные; проемы дверные – ворота дощатые; наружная отделка цоколя – нет; наружная отделка стен – нет; внутренняя отделка – без отделки; инженерное оборудование – нет (вентиляция – естественная вытяжная); общее техническое состояние удовлетворительное. Расположенное на земельном участке площадью 1.4678 га с кадастровым номером 622550100002002685, по адресу: Минская область, Клецкий район, г. Клецк, ул. Казарменная, назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения; находится на праве постоянного пользования у Продавца.

**Начальная цена аукциона с НДС:** 821 214 872 белорусских рубля.

**Размер задатка, текущий (расчетный) счет для внесения суммы задатка:** задаток для участия в аукционе в размере 10% от начальной цены продажи предмета аукциона (82 121 487 белорусских рублей) перечисляется на р/с 3012201430128 в филиале ОАО «Белагропромбанк», Минское областное управление, код банка 942, УНП 600068480. Назначение платежа – задаток 10% от начальной цены предмета аукциона согласно порядка проведения аукциона.

**Место, дата и время проведения аукциона (торги):** 19.09.2013 в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, актовый зал.

**Место, дата и время приема заявлений для участия в аукционе:** по 18.09.2013 до 15.00 в рабочие дни по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, кабинет юрисконсульта.

**Условия аукциона:** Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – единственный зарегистрированный участник торгов, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (единственный зарегистрированный участник торгов) должен оплатить продавцу всю стоимость Объекта в течение 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный зарегистрированный участник торгов) обязан возместить Продавцу стоимость фактических затрат по организации и проведению аукциона в размере на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. На единственного зарегистрированного участника торгов распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

Дополнительную информацию, порядок проведения аукциона можно получить:
**• +375 17 506 92 11 • +375 29 113 79 43**
**• e-mail: raps92@yandex.ru**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Трест Белтрансстрой» (продавец)**

**проводит повторный открытый аукцион по продаже следующего имущества:**

**ЛОТ № 1:** изолированное помещение административного назначения, инвентарный номер 100/D-64620, об. пл. 447,2 кв.м, расположенное по адресу: **Республика Беларусь, Брестская область, г. Брест, ул. Менжинского, д. 30,** в т.ч. компьютерная сеть, теплосчетчик ТЭМ-05м-1 ДУ 32; теплосчетчик ТС-05. **Начальная цена с НДС – 3 800 317 433 бел. руб.** Сведения о земельном участке: 177/1000 доли в праве постоянного пользования на земельный участок, пл. 0,0514 га предоставленного для обслуживания жилого дома.

**ЛОТ № 2:** производственная база, расположенная **по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, г. Брест, ул. Карасева, 100,** в составе: растворный узел, об. пл. 498,7 кв.м; котельная 488 кв.м (в т.ч. оборудование котельной согласно Перечня); бытовые помещения на 90 человек, об. пл. 410,7 кв.м; механическая мастерская, об. пл. 968,5 кв.м; склад сухих лесоматериалов, об. пл. 501,7 кв.м; гараж автоколонны, об. пл. 798,2 кв.м; навес к складу, об. пл. 430 кв.м; пристройка к пилораме, об. пл. 348,3 кв.м; материальный склад № 1, об. пл. 315,9 кв.м; проходная будка, об. пл. 15,7 кв.м; паровая лесосушилка, об. пл. 71,5 кв.м; склад сыпучих материалов, об. пл. 126,3 кв.м; механический склад цемента, об. пл. 45,2 кв.м; здание КНС, об. пл. 46,1 кв.м; материальный склад № 2, об. пл. 368,1 кв.м; здание компрессорной станции, об. пл. 62,4 кв.м; здание для хранения материалов (кладовки), об. пл. 200 кв.м; навес для кислородных баллонов, об. пл. 28,1 кв.м; повышенный путь; бетонный полигон; хранилище для битума; помещение хозяйственного назначения, об. пл. 34 кв.м; в т.ч. тепловые сети, наружный водопровод, мачты освещения метал. 2 шт; мачты освещения метал. 5 шт; линия электропередач 240 мп; канализация. **Начальная цена с НДС – 21 590 133 306 бел.руб.** Обременение: частичная аренда. Площадь земельного участка для обслуживания производственной базы – 3,6287 га. Для обслуживания повышенного пути – 0,6699 га.

**Задаток 5% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Народная газета» от 10.07.2013.*

**Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.**

Аукцион состоится **05 сентября 2013 г.** в **10.00** по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04 сентября 2013 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**


ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 20 жніўня па 31 снежня 2013 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2013 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1. Бесшнуравы тэлефонны апарат Texet TX-D6805A, black, РФ | 7 | 229 000 | 1 603 000 |
| 2 | 24MA53V-PZ Тэлевізар LG 24» LCD 24MA53V-PZ, РФ | 1 | 3 061 000 | 3 061 000 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 4 664 000 (Чатыры мільёны шэсцьсот шэсцьдзясят чатыры тысячы) беларускіх рублёў.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2013 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2013 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд падпісной кампаніі на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2013 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце «Звязда» да двух разоў на тыдзень у перыяд з 20 жніўня па 3 кастрычніка 2013 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 8 кастрычніка 2013 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела падпіскі і перспектыўных праектаў рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Камісія кіруецца ў сваёй дзейнасці рэгламентам (раздзел V гэтых Правілаў).

11. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. РЭГЛАМЕНТ РАБОТЫ КАМІСІІ**

12. Камісія ажыццяўляе кантроль за захаваннем вызначаных правілаў правядзення рэкламнай гульні, вызначае пераможцаў Гульні, якія выйгралі прыз, разглядае скаргі і спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць падчас правядзення Гульні.

13. Пасяджэнні Камісіі вядзе старшыня. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці членаў з яе зарэгістраванага складу.

14. Члены Камісіі абавязаны: прымаць удзел у пасяджэннях Камісіі, забяспечваць падчас Гульні адпаведнасць парадку яе правядзення гэтым Правілам, вызначыць пераможцаў Гульні, якія выйгралі прызы, прымаць удзел у разглядзе скаргаў (пры іх наяўнасці) удзельнікаў, падпісваць пратаколы пасяджэнняў Камісіі.

15. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца ўдзельнікі Гульні, прадстаўнікі незалежных арганізацый.

16. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

17. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

**VI. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

18. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 10 кастрычніка 2013 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

19. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

20. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адным тэлефонным апараце.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — тэлевізар.

21. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

22. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 20 кастрычніка 2013 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 20 кастрычніка 2013 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VII. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

23. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2013 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможца ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2013 года.

24. Адсутнасць у пераможца, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2013 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

25. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 снежня 2013 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

26. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

27. Пасля 31 снежня 2013 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

28. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

29. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

30. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

31. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 18 38.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэкламнай гульні № 2211 ад 25.07.2013 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

Шукайце картку ўдзельніка гульні ў бліжэйшых нумарах газеты!

# АЎСТРАЛІЙСКІЯ ВУЧОНЫЯ СТВАРЫЛІ ПРЫНЦЫПОВА НОВАЕ ЛЯКАРСТВА АД РАКУ

**Аўстралійскія вучоныя стварылі новы лекавы сродак, які, на іх думку, здольны зрабіць рэвалюцыю ў барацьбе з ракавымі захворваннямі. Пра гэта заявіў прафесар універсітэта Новага Паўднёвага Уэльса (Сідней) Пітэр Ганінг.**

У інтэрв'ю тэлеканалу 9News ён расказаў, што новы прэпарат уздзейнічае на бялок трапаміязін, які адказвае за клетачную архітэктуру, тады як лякарствы, якія цяпер прымяняюцца, разбураюць іншы аналагічны бялок — акцін.

«Адна з асноўных праблем заключаецца ў тым, што акцін, які змяшчаецца ў пашкоджаных ракам клетках, практычна нічым не адрозніваецца ад акціну ў клетках сардэчнай мышцы, — расказаў вучоны. — У той жа час мы выявілі што трапаміязін у ракавых клетках мае зусім іншыя характарыстыкі, чым трапаміязін у здаровых клетках арганізма».

«Новы прэпарат выклікае разбурэнне каркаса ракавай клеткі, прычым гэты працэс працякае дастаткова хутка», — патлумачыў Ганінг, удакладніўшы, што здаровыя клеткі застаюцца некранутымі. Паводле яго слоў, праведзеныя выпрабаванні паказалі, што лякарства дзейнічае супраць усіх відаў ракавых пухлін. «Нікому яшчэ не ўдавалася стварыць падобнае лякарства», — падкрэсліў вучоны.

Ганінг расказаў, што спачатку даследаванні вяліся з дапамогай камп'ютарных тэхналогій. Медыкі з універсітэта Новага Паўднёвага Уэльса змадэліравалі ўвогуле 25 тыс. варыянтаў магчымага лякарства, і толькі адзін з іх аказаўся эфектыўным. «Цяпер нашай галоўнай задачай з'яўляецца перайсці ў канцы 2014 года да выпрабавання прэпарата на хворых на нейрабластому (форма дзіцячага раку, якая цяжка лечыцца)», — адзначыў вучоны.

Вынікі працы медыкаў з Сіднея апублікаваны ў часопісе Cancer Research.

**БЕЛТА—ІТАР-ТАСС.**

## Ноччу трэба спаць, а не піць гарэлку

**У Магілёве скарочана колькасць начных крам, дзе можна набыць спіртныя напоі. Раней іх было больш за дзясятак, а цяпер засталося толькі 4, у розных раёнах абласнога цэнтра.**

Кіраўніцтва вобласці і горада настойвае на тым, што начныя крамы, якія гандлююць алкаголем, могуць застацца толькі там, дзе забяспечаны правапарадак. Між тым, жыхары дамоў, паблізу якіх працуюць «начнікі», скардзіліся ўладам на пагаршэнне крымінагеннай сітуацыі. Дзеля прафілактыкі правапарушэнняў і п'янства гарадское кіраўніцтва скараціла колькасць такіх гандлёвых кропак. Прычым тром магазінам дазволена гандляваць алкаголем кругласутачна, а аднаму, які на Пушкінскім праспекце, — толькі да 23.45.

**Ул. інф.**

# БАРШЧЭЎНІК САСНОЎСКАГА «АТАКУЕ» ВІЦЕБШЧЫНУ

**Паводле інфармацыі Мінпрыроды, пасевы небяспечнай для чалавека расліны — баршчэўніку Сасноўскага — займаюць у Беларусі больш за 2,3 тысячы гектараў.**

Усяго ў краіне зарэгістравана каля 3 тысяч месцаў, дзе расце баршчэўнік, а штогод выяўляюцца новыя плошчы яго росту. Спецыялісты канстатуюць, што лідзіруюць у Беларусі па аб'ёме плошчаў, дзе расце баршчэўнік Сасноўскага, Віцебская і Мінская вобласці. У Віцебскай вобласці баршчэўнік займае амаль 1,3 тысячы гектараў, у Мінскай — больш за 360 гектараў. Праблема распаўсюджвання небяспечнай для чалавека расліны звязана з недастатковымі мерамі па яе знішчэнні, упэўнены ў міністэрстве. Толькі сёлета, па звестках прыродаахоўнага ведамства, больш за 200 землекарыстальнікаў атрымалі штрафы за тое, што няякасна правялі агратэхнічныя мерапрыемствы па знішчэнні баршчэўніку.

**Сяргей КУРКАЧ.**


В связи с поступившим заявлением об объявлении гражданина умершим **суд Ошмянского района Гродненской области** просит граждан и юридических лиц в течение двух месяцев со дня публикации сообщить суду (Гродненская область, г. Ошмяны, улица Советская, дом 39) об известных им сведениях в отношении ЗАХАРОВА Станислава Евгеньевича, 22 декабря 1966 года рождения, уроженца г. Рига Латвийской Республики, проживавшего по адресу: Гродненская область, г. Ошмяны, улица Гольшанская, дом 46, квартира 2.



ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**

**28 августа 2013 года проводит 3-й повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности от 06 марта 2013 года на 16-м открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 50 | Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 38 1990 г. 4 кат. КР – 1990 г. в составе: Кузнечный цех – крытый вагон № 20420071 1956 г. Инструментально-механический цех – крытый вагон № 20115895 1956 г. Механический цех № 1 – крытый вагон № 22869937 1956 г. Механический цех № 2 – крытый вагон № 20862207 1956 г. Электросиловой цех – крытый вагон № 20096661 1956 г. Электроремонтный цех – крытый вагон № 20608824 1956 г. Слесарно-сварочный цех – крытый вагон № 20574596 1956 г. Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон № 20020681 1954 г. Авторемонтный цех – крытый вагон № 20032363 1958 г. Цех ремонтно-дизельных двигателей – крытый вагон № 20748190 1952 г. | г. Слуцк, в/ч 18662 | 1 763 000 000 | 52 890 000 |
| 51 | Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 21 1986 г. 4 кат. ДР – 1990 г. в составе: Кузнечный цех – крытый вагон № 20681730. Инструментально-механический цех – крытый вагон № 20269114 • Механический цех № 1 – крытый вагон № 20268876 • Механический цех № 2 – крытый вагон № 20268777 • Электросиловой цех – крытый вагон № 20220885 • Электроремонтный цех – крытый вагон № 20268884 • Слесарно-сварочный цех – крытый вагон № 20339560 • Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон № 20260147 • Авторемонтный цех – крытый вагон № 20260030 • Цех ремонта дизельных двигателей – крытый вагон № 20220877 Все вагоны – 1971 г. | г. Слуцк, в/ч 18662 | 1 469 000 000 | 44 070 000 |
| 52 | Тепловоз ЧМЭ-3 № 915 дв. К6С31ОДР № 411009-4203 генератор TD 802 № 1583208 1970 г. 2 кат., пробег 21 год 6 мес. | п. Жодино, в/ч 48848 | 1 536 000 000 | 46 080 000 |
| 53 | Мост автодорожный (шифр ВАР) № 1 1981 г. 2 кат., наработка 0,5 года | п. Жодино, в/ч 48848 | 1 477 000 000 | 44 310 000 |
| 54 | Мост автодорожный (шифр ВАР) № 2 1981 г. 3 кат., наработка 0,5 года | п. Жодино, в/ч 48848 | 1 477 000 000 | 44 310 000 |

**Извещение о проведении аукциона № 3 от 06.03.2013 опубликовано в газете «Звязда» № 18 от 30.01.2013 года.**
**Условия проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 130 от 17 июля 2013 года.**

УНП 101099370



**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырская торговая компания «Полесье» (продавец)**

**извещает о проведении 30 августа 2013 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-8**

| № лота | Наименование | Адрес объектов | Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. | Начальная цена продажи имущества одним лотом, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание одноэтажного кирпичного магазина № 56, инв. № 330/С-7946 площадью 61,2 кв.м | Гомельская обл., г. Мозырь, ул. 17 Сентября, 58А | 58 969 200 | 60 289 800 | 6 030 000 |
| | Многолетние насаждения в количестве двух деревьев (берез) | | 1 320 600 | | |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье», 247760, г. Мозырь, ул. Ветровая, 21, тел. 8(0236) 37 67 39.

**Шаг аукциона – 5% от начальной цены лота.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье») р/с № 3012203350014 в отделении ОАО «Белагропромбанк» г. Мозырь, МФО 151501945, УНП 400082468, ОКПО 01568553 **по 28 августа 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 28 августа 2013 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются и по почте не принимаются.

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. **Документы, необходимые для подачи заявления на участие в аукционе, опубликованы в газете «Звязда» от 30.01.2013 г.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: **www.gomeloblreklama.by**

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: **8 (0232) 74 59 73, 74 17 34.**


■ Футбол

# ІНТАРЭС ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ?

Таварыскі матч паміж зборнымі Беларусі і Чарнагорыі так і не сабраў у Жодзіне сапраўдны аншлаг

Фота Сяргея ГУДЗІЛІНА.



Сяргей КАРНІЛЕНКА з пенальці адпраўляе мяч у вароты зборнай Чарнагорыі.

**Што казаць, сумна, калі на матчы нацыянальнай зборнай прыходзіць усяго некалькі тысяч балельшчыкаў. І гэтага зусім не разумееш, бо яшчэ сам добра памятаеш, як цалкам запоўнены стадыён «Дынама» хорам падтрымліваў зборную падчас гульняў з Італіяй, Нарвегіяй, Украінай. А цяпер...**

— У касах прадалі дзесьці тысячу квіткоў, — падчас сустрэчы кажа дырэктар жодзінскага стадыёна «Тарпеда» Яўген Горыд. — Але трэба ўлічваць, што білеты распаўсюджвалі таксама праз інтэрнэт.

У выніку на паядынку прысутнічалі 3 тысячы гледачоў. Безумоўна, можна спрачацца, ці мэтазгодна было гуляць у невялікім Жодзіне, а не, напрыклад, у Брэсце ці Гродне. Але факт ёсць факт. Зборная Георгія Кандрацьева знаходзіцца пакуль на апошняй пазіцыі сваёй групы ў адборачным турніры першынства свету і відавочна згубіла пэўную частку аўдыторыі.

— Я часткова згодны з тым, што мы павінны ў чарговы раз улюбіць у зборную балельшчыкаў, — разважае нападаючы нацыянальнай каманды і калінінградскай «Балтыкі» Максім Скавыш. — Будзе вынік ад нас — будуць заўзятары.

Цікава, што на Міншчыну дабралася нават некалькі чарнагорскіх футбольных прыхільнікаў. Настрой перад гульнёй у экс-югаславаў быў нармальны. Кіраўнік тамтэйшай федэрацыі, легендарны паўабаронца італьянскага «Мілана» Дзеян Савічавіч наогул перад матчам усміхаўся, з'еў марозіва «Каштан» і пасядзеў з калегамі ў невялікай кавярні.

— Мяне вельмі здзівіў і ўразіў Мінск, — прызнаўся Савічавіч. — У вас вельмі шмат зялёных паркаў і бульвараў. А што тычыцца зборнай Беларусі, я глядзеў усяго некалькі матчаў з вашай адборачнай групы. Беларусь трапіла ў кампанію да моцных зборных (нагадаем, што нашым суайчыннікам выпала спрачацца за квіток на першынство свету з французамі, іспанцамі, фінамі і грузінамі. — **Аўт**.). А таму прадэманстраваць нашмат лепшы вынік, чым ёсць зараз, будзе неверагодна цяжка.

Гульня ў выкананні беларусаў, між іншым, не атрымалася феерычнай. Моманты ў нашых хлопцаў былі рэдкія, але небяспечныя. Тое самае можна сказаць пра гасцей, у якіх лепш за іншых выглядалі лідары — нападаючы «Манчэстэр Сіці» Стэван Явеціч і форвард «Ювентуса» Мірка Вучыніч. Часам яны рабілі на полі такія карагоды, ад якіх галаву можна зламаць. Аднак чарнагорскія «зоркі» дзейнічалі пераважна спакойна і майку, каб забіць, на сабе не разрывалі. Праўда, Вучынічу і нешматлікіх сітуацый хапіла, каб у другой палове зрабіць лік роўным.

— Хлопцы добра ўсведамлялі, што гуляюць таварыскі матч. А таму ў асноўным стаялі наперадзе і чакалі сваіх галявых момантаў, — прызнаўся пасля сустрэчы паўабаронца Аляксандр Глеб.

Праўда, чарнагорскі стрэл здарыўся пасля таго, як Сяргей Карніленка адкрыў лік у матчы з пенальці. Адметна, што рукой у сваёй штрафной згуляў ураджэнец Бялграда Марка Сіміч, былы гулец БАТЭ, які праводзіў дэбютны матч за чарнагорцаў.

— Безумоўна, непрыемна, калі падобнае здараецца ў першым матчы за нацыянальную каманду, — прызнаецца Марка.

— Ты нарадзіўся ў Сербіі. Як прыняў грамадзянства?

— У мяне ў Чарнагорыі жывуць сваякі. Акрамя гэтага, атрымаў ад федэрацыі запрашэнне. Ёсць у зборнай і тыя, з кім ужо раней калісьці гуляў. Усё добра. Будзем рыхтавацца да адборачнай гульні з Польшчай.

Па вялікім рахунку, нічыя (1:1) з камандай, якая ўваходзіць у трыццатку лепшых зборных планеты, — вынік нядрэнны, але дома, зразумела, таксама хочацца перамагаць.

— Нам не хапіла ўдараў. Мы шмат разоў ператрымлівалі мяч. Калі б больш білі па варотах, быў бы іншы вынік, — рэзюмуе нічыю Максім Скавыш.

Цяпер у планах нашай каманды падрыхтоўка да адказнай гульні са зборнай Францыі, якую 10 верасня прыме Гомель. Папярэднічае паядынку з «трохкаляровымі» 6 верасня таварыскі матч са зборнай... Кыргызстана, якая яшчэ ніколі не трапляла ў фінальную стадыю буйных футбольных турніраў свету і Азіі. «Што сказаць, з кім дамовіліся, з тым і будзем сустракацца», — неяк шматзначна сказаў Аляксандр Глеб.

Матч зноў пройдзе ў Жодзіне. І нешта падказвае, што зборная ў чарговы раз можа застацца без гучнай падтрымкі.

**Тарас ШЧЫРЫ,**
*г. Жодзіна*

■ Жыццёвінкі

# СЁННЯ-ЗАЎТРА

**1.**

Была восень, халодная і дажджлівая. Амаль з усіх дрэў лісце асыпалася, услала дол жоўтым дыванком, і калі б дзе ў горадзе, то яго б, лісце тое, даўно згрэблі і адвезлі прэч з вачэй, а тут, у вёсцы, каля гэтае хаты няма каму прыбраць: памерлі даўно гаспадары. Хатка ж таксама ледзьве ліпіць на гэтым свеце — варта, здаецца, разгуляцца больш-менш моцнаму ўрагану, і ён спляжыць яе.

Якраз вось у такі восеньскі час і завітаў да хаты дзеда Саўкі і бабкі Ганны ўнук Іван Дзмітрыевіч Гапееў. Жыве ён у Санкт-Пецярбургу, ваенны пенсіянер. Ніколі не думаў, што звяжа свой лёс з арміяй, а так атрымалася, што пасля вучобы ў Брэсцкім ПТВ радыёэлектронікі хлопцу прапанавалі ў ваенкамаце паступаць у вайсковае вучылішча. Паслухаўся і не прагадаў, бо там ён цалкам, як аказалася, знайшоў сябе, шчодра рэалізаваў свой талент: мае шэраг вынаходніцтваў, некалькі ўзнагарод, даслужыўся да падпалкоўніка. Што б, здавалася, яшчэ трэба чалавеку? Пенсія неблагая, дочкі выйшлі замуж. Аднак не дае спакою родная бацькоўская зямля, прыходзіць не толькі ў сны, а пастаянна вярэдзіць душу. І пры першай магчымасці Іван Дзмітрыевіч стараецца наведацца ў в. Іскань, што на Быхаўшчыне. Пастаіць каля магілак дарагіх людзей... А потым пойдзе да хат. Хаты — праз дарогу адна ад аднае, насупраць. Бацькоўская з блокаў, не дужа яшчэ старая, таму ў ёй жывуць сёння чужыя людзі. А дзядулева з бабуляй — вось яна... адчыняй, заходзь. Яна — твая. Сёння, заўтра... назаўсёды. Зайсці хіба? Не, не хапае духу. Ці вытрымае сэрца? У гэтай хаце прайшло ягонае дзяцінства. Там усё так, як было, забралі толькі карткі са сцяны. Тая ж печ, той жа ўслон, той жа стол, той жа ложак... І — ціш-цішыня. Хоць, калі прыкласці вуха да сцяны, то можна, пэўна ж, пачуць, як гудзе-плача хата. Няпроста глядзець на ўсё гэта. Цяжка.

У той апошні свой прыезд Іван Дзмітрыевіч папрасіў у суседа лом і шчэпці і сарваў з дзвярэй сенцаў клямку. Ён вёз яе ў Санкт-Пецярбург як самую каштоўную рэч. І ўзгадваў людзей, што браліся за клямку. І яму ад гэтага рабілася неяк светла на душы...

Цяпер яна будзе ў яго на дачы. Адчыняючы там дзверы, ён возьмецца за клямку і абавязкова адчуе цеплыню рук самых дарагіх яму людзей...

**2.**

Перабіраем з жонкай грыбы. Яна ў мяне з-пад Іжэўска, і таму гамонка больш пра тамтэйшыя грыбныя мясціны. Яшчэ б не! Бываў, бываў у лесе, ведаю: ёсць чым пахваліцца Валянціне — сапраўды, грыбоў там больш, бо і лясоў жа больш. А грыбнікоў, мусіць жа, столькі. Таму ўсё зразумела.

Каб не гэтыя грыбы, то і не пагаманілі б. Калі б яшчэ мы селі насупраць адзін аднаго ды сталі ўспамінаць-прыгадваць? Няма ж часу! То тэлевізар, то камп'ютар, то кухня, то паход у краму... А тут грыбы прывязалі да стала. Дзякуй грыбам!

Жонка расказвае — у які ўжо раз! — пра свой род, пра дзяцінства, пра школу. Дарэчы, каля той школы, дзе яна вучылася, я праходзіў неяк і звярнуў увагу на шыльду, з якой даведаўся, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны там працаваў вядомы педагог-наватар з Кіраваградчыны Васіль Сухамлінскі.

Грыбы перабралі. А я не спяшаюся з-за стала. Гляджу на жонку і злёгку ўсміхаюся: стаяла, аказваецца, і ты ў куце. Прыгадаў і я кут у класе, у якім стаяў. Было. Толькі, у адрозненне ад жончынага, я не бачыў краем вока праз шыбіну, як бурылі царкву. Проста ў нас кут быў цёмны, ды і не было ў вёсцы царквы. Валі ж пашанцавала: ніхто з аднакласнікаў не бачыў, а яна — бачыла. Яна сфатаграфавала ў памяці той момант на ўсё жыццё.

А за што, пытаецеся, паставілі ў кут? Не магла вымавіць літару «р», а настаўніцу звалі «Праскоў'я Хрыстафораўна». Тая нічога не прыдумала лепшага, як пакараць: «Пакуль не звернешся да мяне як трэба, стой у куце!»

Іншы раз з кута, аказваецца, далёка бачыцца... і на ўсё жыццё.

**3.**

Еду ў тралейбусе. Уладкаваўся ўдала: сяджу. Назіраю, што робіцца за акном. А што там робіцца? Хлопцы ў спецвопратцы мяняюць на суседняй вуліцы трубы ацяплення, узадралі асфальт, горы зямлі... Не паспелі за лета, прыхапілі восень. І ўсюды легкавікі, легкавікі. Налеплены каля офісаў і цягнуцца ўзбоч, спераду і ззаду. Нехта за спінай кажа: «Усе вуліцы ў горадзе, дзе толькі можна было, пашырылі, а ўсё роўна цесна. Хутка ў Гомелі нашым на працу будзеш дабірацца, як у той Маскве... Столькі машын! А ў гаражах жа колькі іх стаіць!»

Ну, і так далей. Едзем, адным словам. Нічым бы не запомнілася і гэтая чарговая мая паездка ў цэнтр горада, каб не разыграўся маленькі спектакль. Мужчына, які падсеў да мяне, працягнуў дзяўчыне, што стаяла бліжэй да кампосцера, талончык: прабі, родненькая. Дзяўчына зрабіла выгляд, што не чуе, тады ён тармаснуў яе за рукаў: ці чуеш ты? Нуль увагі. Талончык прабілі іншыя людзі. А дзяўчына хоць бы што — моўчкі трымалася за поручань. Потым ёй талончык працягнула бабулька. Тая ж рэакцыя. Мо недачувае? Дык не ж, тузаюць за рукаў. Ды і на твар паглядзіце яе — усё яна чуе і бачыць, проста прыкідваецца тралейбуснай прынцэсай: я вам хто? Ну дык вось! Свае праблемы самі і вырашайце — устаньце, не палянуйцеся і пракампасціруйце талончык. Лакеяў няма.

Той мужчына, што падсеў да мяне, не вытрымаў нарэшце і стаў выхоўваць дзяўчыну:

— І як табе не сорамна?!

Дзяўчына, злосна глянуўшы на мужчыну, папракнула яго:

— Не «табе», а «вам»!

А паколькі на тым прыпынку, дзе зайшла ў тралейбус дзяўчына, знаходзіцца інтэрнат медінстытута, то і мужчына прыняў яе за студэнтку:

— І вось такія людзі будуць нас лячыць! І як можна даверыць ім сваё жыццё, хто адкажа мне? Ай-яй-яй! Куды ідзём? Куды коцімся?

Вы б толькі бачылі, як прыемна запунсавеўся тварык у дзяўчыны, на яго ўсплыла лагода: яе прынялі за студэнтку, за будучага ўрача! Дык што вам тады трэба? Ведайце, з кім маеце справу, аднак!..

І яна горда трымала галаву, не зводзячы вачэй з кампосцера, які быў перад самым носам. Ну, цяжка табе закампасціраваць талончык — адыдзі, калі ласка, убок, іншыя гэта зробяць. Не — стаіць, як прыкіпела, на адным месцы.

...Праз тыдзень недзе я пазнаў у тым жа тралейбусе мужчыну, які абураўся паводзінамі дзяўчыны. Павіталіся, як старыя знаёмыя. Разгаварыліся. Прыгадалі і выпадак з кампасціраваннем талончыка.

— У той гісторыі ёсць працяг, — хітравата-загадкава паглядзеў на мяне мужчына.— Калі цікава, то раскажу. Не паверыце, але так было. Кіно дый толькі! Учора мой сын прыводзіць тую самую дзяўчыну дадому і заяўляе: мама, тата, пазнаёмцеся — Аксана, мы вырашылі пабрацца шлюбам. У мяне, адчуў, адразу падскочыў ціск, а дзяўчына — ну ці не нахабніца? — зрабіла выгляд, што ўпершыню мяне бачыць. Я нічога не адказаў сыну, моўчкі выйшаў з пакоя... Памыліўся я тады, ніякая яна не студэнтка, робіць на пошце апаратарам... Вось так, братка... А з сынам я яшчэ добранька пагавару... Выберу час і пагавару... Трэба ратаваць хлопца... Хаця ж ці слухаюцца яны нас, маладыя?..

**4.**

Максім Сцяпанавіч ездзіў да ўнука-салдата ў суседні горад, а калі вярнуўся, то доўга абураўся:

— Пазнаёміўся з камандзірам роты. Хлопец быццам бы нічога, талковы. Толькі адзін недахоп мае... І сур'ёзны. Салдат не ведае. «Радавы Пятроў»— і ўсё. Гэтага мала, сябра, ой як мала! Я ж, калі дырэктарам школы працаваў, кожнага вучня ведаў — як зваць, хто бацька, хто маці... Што п'юць і што ядуць... А ён пра майго ўнука і сказаў толькі ўсяго: а, радавы Канцавы? Ён у трэцім узводзе, зараз паклічам. Я пацікавіўся: служыць Паўлік ужо паўгода, як ён? Камандзір пацісную плячыма: узводны раскажа, ён бліжэй да салдата. Ён, бачыце, бліжэй... А што табе перашкаджае быць бліжэй? Э не, так нельга, братка. А ў мяне ж у школе было ў два разы больш чалавек, чым у роце, мабыць... Ды яшчэ настаўнікаў колькі...

Максім Сцяпанавіч вельмі шкадаваў, што не сказаў усяго гэтага ротнаму. І даў сабе слова зрабіць гэта, калі паедзе яшчэ праведаць унука. Праўду ж кажуць у народзе: «Добрая мысля прыходзіць апасля».

**5.**

Атрымалася так, што ў Грышачкіна забралі вадзіцельскае пасведчанне. Міліцыянер ДАІ паднёс да яго роту трубачку-алкатэст, загадаў дыхнуць. Грышачкін і сам адчуваў, што пасля ўчарашняй п'янкі вынік будзе станоўчы. Спрачацца не стаў — дыхнуў. Гэта каб у яго была не фура, а легкавік, на якім ездзіць можна хіба што на рыбалку і па грыбы, ён бы і не бедаваў асабліва. Але ж яму трэба карміць сям'ю. Нічога іншага, як круціць «абаранак», рабіць не ўмее. Перад яго вачыма ў той час, калі стаяў твар у твар з міліцыянерам ДАІ, паплылі кругі, і ён нават пахіснуўся. Адразу ж убачыў раз'юшаны твар жонкі, якая, дарэчы, учора ў кампаніі — хто прыдумаў гэты дзень нараджэння адзначаць у нядзелю, перад працай, папытаць бы! — перасцерагала яго: «Міця, хопіць! Заўтра ж табе за руль!..»

Не паслухаўся, аднак. Што ж і сапраўды цяпер рабіць, як шукаць выйсце з гэтай складанай сітуацыі? Жонка пакрычала-павыхоўвала мужа, але ж і сцяміла, што адным крыкам справу не вырашыш, і яны селі за стол і доўга меркавалі: да каго б звярнуцца, каб паспрыяў вярнуць пасведчанне? Перабралі ўсіх сваякоў і знаёмых — няма такіх. Аднак потым жонка ўспомніла, што некалі вучылася ў адным класе з хлопцам, які зараз займае высокую пасаду. Хіба да яго падысці? Усё ж — аднакласнік, зямляк. Ды і Міця павінен яго ведаць — у вёсцы ж сустракаліся, і не раз. Таму настрой у мужа і жонкі адразу падняўся, і яны сабраліся да свайго выратавальніка. І той увайшоў у становішча, паспрыяў, каб пасведчанне кіроўцы Грышачкіну вярнулі.

Атрымаўшы дакументы, шчаслівы Грышачкін павёз неўзабаве груз у Маскву. Там яго сустрэў прадстаўнік фірмы, для якой прызначаўся груз, і прапанаваў спярша паснедаць (была раніца), а тады і заняцца справамі. Паабедалі паблізу ў кавярні, а калі вярнуліся, грузу ў фуры не аказалася. Больш цяжкай хвіліны ў жыцці шафёра не было. Знік груз на дваццаць тысяч даляраў! Кінуліся тудысюды — нічога не дапамагло. Так ні з чым і вярнуўся ў свой горад Грышачкін. Але дамоў не паехаў. Паехаў да жончынага земляка, увайшоў у кабінет, не зважаючы на пярэчанні сакратаркі, і з парога накінуўся на яго:

— Што ж ты нарабіў, землячок?! Навошта ты вярнуў мне правы? Навошта, я ў цябе пытаю, а?!

І, няўпэўнена ступаючы, Грышачкін пакінуў кабінет, нічога больш не сказаўшы чалавеку, які некалі выручыў яго з бяды. Але ж хто думаў, што да другой бяды, яшчэ больш жорсткай, цяжкай, так блізка, усяго адзін крок?..

**6.**

На кавеньку, якая сіратліва стаяла, прыткнутая да касы, адразу звярнулі ў краме ўвагу.

— Чый гэта кiёк? — першай узяла кавеньку адміністратар залы: так у яе было напісана на жэтончыку, прымацаваным да жакеціка.— Людзі, чый гэта кiёк?

Людзі ж праходзілі міма: той-сёй моўчкі паціскаў плячыма, нехта раіў пачакаць, маўляў, хто забыўся, вернецца сам, забярэ, бяды тае.

Прайшло некалькі дзён. Па кавеньку так ніхто і не прыйшоў. Але яе не прыбіралі з віднага месца — а раптам знойдзецца гаспадар?

А жанчына з жэтончыкам на жакеціку паглядзела аднойчы на кавеньку, усміхнулася і прамовіла да сяброўак:

— А ведаеце, некаму яна ўжо і не трэба, мусіць? Калі забыліся... Чалавек, значыць, папраўіўся, не хварэе... А каб няможна было яму ісці ад нас, з крамы, дадому — адразу б успомніў пра яе. На аднаго здаровага чалавека, выходзіць, стала больш. Гэта ж вельмі добра!

**Васіль ТКАЧОЎ**

Даты | Падзеі | Людзі

***Міжнародны дзень бяздомных жывёл. Адзначаецца па прапанове Міжнароднага таварыства праваў жывёл ЗША.***

**1920** год — нарадзіўся Леанід Ігнатавіч Бяда, генерал-лейтэнант, двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1942 года на Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах — пілот, камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка. Удзельнік Сталінградскай бітвы, вызвалення Беларусі, Украіны, Літвы, наступальных аперацый ва Усходняй Прусіі і Польшчы. Здзейсніў 214 баявых вылетаў. Пасля вайны камандаваў авіяцыйным палком, дывізіяй, авіяцыяй Беларускай ваеннай акругі. Загінуў у 1976 годзе ў аўтакатастрофе. Яго іменем названы вуліцы ў Мінску і Лідзе, імя прысвоена авіяцыйным клубам, маладзёвым будаўнічым атрадам. Леанід Бяда — ганаровы грамадзянін Ліды.



**1913** год — у Брэсце ў сям'і банкаўскага служачага нарадзіўся Менахем Бегін, будучы прэм'ер-міністр Ізраіля і лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру. З юных гадоў ён быў актыўным сіяністам і ў канцы 1930-х стаў вядомай палітычнай фігурай. НКУС арыштаваў Бегіна ў 1939 годзе ў Вільні, куды той уцякаў з Польшчы, ратуючыся ад фашысцкай акупацыі. Яго асудзілі да васьмі гадоў зняволення, але праз год нечакана вызвалілі з Пячорлага. Менахем перабраўся ў Палесціну, дзе стаў адным з лідараў падпольнай барацьбы яўрэяў супраць брытанскай адміністрацыі. Людзі Бегіна здзяйснялі выбухі, нападалі на цягнікі, захоплівалі ў заложнікі англійскіх салдат. За яго галаву абяцалі ўзнагароду ў 30 тысяч долараў. Калі Бегін у 1977 годзе ўзначаліў ізраільскі кабінет, у Брытаніі яго доўга па інерцыі называлі тэрарыстам. Нобелеўскую прэмію міру Бегін атрымаў разам з егіпецкім прэзідэнтам Анварам Садатам: падпісаныя імі ў 1978 годзе Кемп-Дэвідскія пагадненні прывялі да стабілізацыі на Блізкім Усходзе. Кар'ера гэтага жорсткага палітыка перапынілася ў верасні 1983 года: ён цяжка перажываў смерць любімай жонкі Аліз і вырашыў пайсці на спачынак. Памёр Бегін 9 сакавіка 1992 года ў Іерусаліме.

**1961** год — нарадзіўся Раман Сцяпанавіч Матульскі, беларускі педагог, доктар педагагічных навук (2003), прафесар (2006). З 1998 года — дэкан у Беларускім універсітэце культуры і мастацтваў, з 2003-га — дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Даследуе тэорыю бібліятэчнай справы і бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг, статыстыку, кіраванне бібліятэчнай справай, бібліятэчна-інфармацыйную адукацыю. Аўтар прац «Бібліятэчная справа ў краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы: арганізацыйна-функцыянальны аспект», «Бібліятэка як сацыяльны інстытут», «Агульнае бібліятэказнаўства».

Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, пісьменнік, публіцыст:**

*«Лепей за ўсё смяяцца з сябе. Ніхто не крыўдуе».*



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.

# «БЕЛАРУСКАЙ БУЛЬБЕ СЛАВА...»

**Па гарызанталі: 1.** «Жніце, жнейкі маладыя,\\\\У вас ... залатыя». З беларускай народнай песні «А ў нас сёння зажыначкі». **3.** Тое, што і сядзіба. **8.** Бульба — хлебу ... (прык.). **10.** Горад на Магілёўшчыне, у мінулым цэнтр павета, які славіўся высакаякаснай бульбай. **11.** Рыбалоўная прылада. **12.** Калектыў артыстаў тэатра. **13.** «Печаная бульба — гэта казка,\\\\Паскрабеш нажом — і калі ... .\\\\Жоўтая скарынка як пірог». («Бульба». П.Панчанка). **14.** «І на ... таксама клёцкі елі». («Чышчу бульбу». Р.Барадулін). **15.** «Звон падала свой ..., пралятаючы».(«Канцэрт у сене». М.Танк). **17.** «Праз ... вяселле,\\\\А яна\\\\Капае бульбу, маладая». («Капае бульбу маладая». М.Маляўка). **21.** Верш Я.Купалы. («Наспелая постаць шчаслівых пасеваў»). **22.** Успенне (28 жніўня) — цягні бульбу за ...(прык.). **23.** Сістэма лічэння дзён у годзе. **24.** Вішнёвая настойка.

**Па вертыкалі: 1.** Той, хто сее зярно. **2.** «Беларускай бульбе слава\\\\Ходзіць шумна з края ў ...(«Бульба». В.Голуб). **4.** Крупы з бульбянога крухмалу. **5.** Сярэдняпозні і позні гатунак бульбы. **6.** Падобная на бульбу расліна, якая вырошчваецца ў паўднёвых краінах. **7.** «Печаў усіх ... -\\\\Бульба плыве ў чыгунку». («Дома». С.Законнікаў). **9.** Тэрытарыяльная адзінка на паўночным усходзе Віцебшчыны; была найбольш значным на Беларусі бульбаводчым цэнтрам напрыканцы XVIII стагоддзя. **14.** Травяністая расліна з пустым сцяблом і белымі або ружаватымі кветкамі. **16.** Ранні і сярэдняранні гатунак бульбы. **18.** «З бульбы мука, з бульбы ...\\\\Прападзі ты, доля наша». Словы з polькі, якія можна лічыць гімнам бульбе. **19.** Участак поля з пасевамі рысу. **21.** ... і ацтэкі; індзейцы Паўднёвай Амерыкі, якія вырошчвалі бульбу з даўніх часоў.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Сярпочкі. 3. Асепішча. 8. Падмога. 10. Быхаў. 11. Восці. 12. Трупа. 13. Ласка. 14. Дзяды. 15. Пчала. 17. Дзень. 21. «Жніво». 22. Карэнне. 23. Каляндар. 24. Вішнёўка.

**Па вертыкалі:** 1. Сейбіт. 2. Край. 4. Сага. 5. «Арбіта». 6. Ямс. 7. Гаспадыня. 9. Полаччына. 14. Дуднік. 16. «Аноста». 18. Каша. 19. Чэк. 20. Інкі.


## УП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЮТСЯ:

СПЕЦИАЛИСТЫ (С ОПЫТОМ РАБОТЫ):

- МАСТЕР
  УП ЖЭС 1 (ул. Интернациональная, 4)
  УП ЖЭС 13 (ул. Нововиленская, 6)
  УП ЖЭС 34 (пр. Независимости, 27а)
  УП ЖЭС 38 (ул. Сторожевская, 8)
- ИНЖЕНЕР-ЭНЕРГЕТИК
- ИНЖЕНЕР в технический отдел на период декретного отпуска
- ИНЖЕНЕР ПО ГРАЖДАНСКОЙ ОБОРОНЕ
- ПАСПОРТИСТ (ул. М. Танка 36/1)

Возможен карьерный рост!

РАБОЧИЕ:

- ТРАКТОРИСТ
- НАЛАДЧИК КИП и А
- СЛЕСАРЬ-САНТЕХНИК УП ЖЭС
- КРОВЕЛЬЩИК по металлическим кровлям УП ЖЭС
- МАЛЯР УП ЖЭС (Требования 3-4 разряд)
- ЭЛЕКТРОМОНТЕР УП ЖЭС (Требования 3-4 разряд)
- ОПЕРАТОР ПЭВМ (б-р Шевченко, 20)
- СЛЕСАРЬ-ЭЛЕКТРИК по ремонту электрооборудования (ул. Нововиленская, 10а)
- ГРУЗЧИК (ул. Новаторская, 53а)
- РАБОЧИЕ по комплексной уборке УП ЖЭС

*Возможно обучение и повышение квалификации по указанным профессиям на производстве*

СВОЕВРЕМЕННАЯ з/плата! ПОЛНЫЙ СОЦ. ПАКЕТ (оказание мат. помощи к отпуску, выделение путевок на оздоровление, постановка на квартирный учет нуждающихся)!

Дружный и доброжелательный коллектив! Будем рады всем!

Обращаться по адресу: г. Минск ул. Комсомольская, 20а

Тел.: 327 67 52

УНП 100055817


■ На слыху

## БАНКАЎСКІ РАБОТНІК ЗАГІНУЛА НА КАРПАРАТЫВЕ

**У Полацкім раёне на беразе возера супрацоўнікі банка адпачывалі ў сваім коле. Адна з работніц установы заснула пад дрэвам, а потым літаральна скацілася па схіле і трапіла ў вогнішча. У выніку атрыманых апёкаў жанчына памерла.**

— Трагедыя адбылася каля 1 гадзіны ночы. Загінула жанчына, 1965 года нараджэння. Установлена, што яна знаходзілася ў нецвярозым стане. Калі адбыўся няшчасны выпадак, калегі жанчыны купаліся, таму не змаглі ёй аказаць дапамогу. Праверка праводзіцца Полацкім міжраённым аддзелам Следчага камітэта, — расказала **Іна ГАРБАЧОВА, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці.**

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## БРЫТАНСКІЯ ВУЧОНЫЯ ВЫНАЙШЛІ «ІНДЫКАТАР СМЕРЦІ»

**Брытанскія фізікі вынайшлі ўстройства, якое здольнае вызначыць, колькі чалавеку засталося жыць, перадаюць інфармагенцтвы.**

Навуковая распрацоўка належыць вучоным з брытанскага ўніверсітэта Ланкастэра. Знешне ўстройства, якое атрымала назву «індыкатар смерці», нагадвае звычайны гадзіннік. З дапамогай бязбольнага лазернага выпраменьвання ўстройства аналізуе стан эндатэліяльных клетак у арганізме і вылічвае хуткасць старэння чалавека. Вынікі тэста паказваюць лічбы ад 0 да 100, дзе 100 — гэта аптымальнае функцыянаванне цалкам здаровага маладога арганізма, а 0 азначае смерць.

Урачы плануюць выкарыстаць «індыкатар смерці» ўжо праз тры гады. Вынаходка дапаможа ім таксама правяраць пацыентаў на схільнасць да прыдуркаватасці і анкалагічных захворванняў. Паводле слоў распрацоўшчыкаў прыбора, вынікі тэста з часам будуць занесены ў адну базу даных, звяраючыся з якой можна будзе максімальна дакладна вызначыць рэсурс арганізма.

Тым часам брытанскія СМІ задаюцца этычным бокам пытання, паколькі такую базу даных змогуць выкарыстаць не толькі ўрачы. Напрыклад, банкі могуць цікавіцца такой інфармацыяй пры разглядзе пытання аб крэдытаванні фізічных асоб на працяглы тэрмін.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.49 | 20.37 | 14.48 |
| Віцебск | — 5.35 | 20.30 | 14.55 |
| Магілёў | — 5.40 | 20.27 | 14.47 |
| Гомель | — 5.41 | 20.19 | 14.38 |
| Гродна | — 6.05 | 20.51 | 14.46 |
| Брэст | — 6.10 | 20.47 | 14.37 |

**Месяц**

***Першая квадра 14 жніўня. Месяц у сузор'і Стральца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Антона, Ісака, Кузьмы.*
***К.*** *Элеаноры, Роха, Сцяпана, Яўхіма.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Перш чым ажаніцца, паспрабуйце з выбранніцай удваіх паклеіць шпалеры. Калі не пасварыцеся ўшчэнт, а застанецеся задаволеныя — вы проста створаны адно для аднаго!**

Муж навучае жонку вадзіць аўтамабіль:

— На чырвонае святло стой, на зялёнае можна ехаць. На мой спалоханы твар не звяртай увагі.

**Жанчыны і грошы адначасова бываюць толькі ў стрыптызёраў.**

Як пазбегнуць угону? Саветы супрацоўнікаў ДАІ.

1. Не купляйце аўтамабіль.

**Настаўніца французскай, правяраючы сшыткі, мацюкаецца ўсё роўна па-руску.**



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне»— 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.314. Індэкс 63850. Зак. № 3534.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 жніўня 2013 года.